Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся — Пролетарии всех стран, соединяйтесь — Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

XII ГОД ВЫДАНЬНЯ — ШТОДЗЕННАЯ

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

НЯДЗЕЛЯ 12 КРАСАВІКА — № 84 (3172)

ОРГАН Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

Алма-Ата, Почта 87

Яшчэ адна перамога на фронце сацыялістычнага будаўніцтва

Па пастанове ўрадавай камісіі пры Саўнаркоме БССР яшчэ 74 прадпрыемствы ў БССР пераводзяцца на сямігадзінны рабочы дзень у 1931 годзе

Другой бальшавіцкай—ударныя тэмпы!

Набліжаюцца першыя дні выхаду ў ...е, першыя дні веснавой сяўбы. Заходзіцца лічаныя ўдарныя рашаючыя ... падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай. Гэтыя дні павінны стаць сапраўдным бальшавіцкімі днямі ўдарнай напругі ... падрыхтоўчай работы. Трэба ...ссмальна скарыстаць застаўшыйся ...откі час падрыхтоўкі з тым, каб ...ткаць сяўбу ўзброенай падрыхтаванасцю. Гэта неабходна падкрэсліць ...э і таму, што па радзе вучасткаў ...рыхтоўкі да сяўбы маюцца прарывы і што гэтыя прарывы на сёньнешні ...нь яшчэ не ліквідаваны.

ЦК прымушан устанавіць, што да ...ай пары яшчэ няма ў наяўнасьці ра...неабходных умоў пасьпяховага пра...ньня сяўбы. Адсутнасьць-жа гэ...умоў тлумачыцца перш за ўсё ..., што парторганы не ўдзялялі ра...ньню гэтай задачы неабходных сіл ...еабходнай увагі» (зварот ЦК ад 5 ...савіка 1931 году).

...ы прымушаны канстатаваць незданьняючасьць падрыхтоўкі на рашаю...вучастках пасеўнай. Да гэтага ча...яшчэ не адчуваецца належнай удар... работы па правядзеньню ў баяз...гатоўнасьць да выхаду ў поле саў...аў і калгасаў. Адным з прарываў, ...не ліквідаван яшчэ і да гэтага ча... зьяўляецца—збор і ачыстка калгас...насенных фондаў, стварэньне фу...ных фондаў, стварэньне страхавых ...асенных фондаў у аднаасобным сэк...ры.

...а 5-га красавіка плян па стварэньнасенных фондаў у калгасах выка...на 53 проц., страхавых фондаў—36 проц. Асабліва адстае аднаасоб...сэктар: у аднаасобным сэктары ...па стварэньні насенфондаў выка...ны толькі на 45,4 проц., страхавых—...проц. Марудна таксама ідзе загаз...ка насеньня тэхкультур і траў. ...ан па загатоўцы насеньня тэхкуль...выканан на 62,5 проц., траў і лу...у—толькі на 10,2 проц. Ня лепш ...ць справа і з браніраваньнем фу...ных фондаў. Па грубых кармох ...аньне выканана на 32,1 проц., па ...нтраваных—38,7 проц.

...рыведзеныя процанты паказваюць, ...а гэтых адказнейшых вучаст...сяўбы прарыў яшчэ не ліквідава...

...збор калгасных насенных і фураж...х фондаў павінен быць пераведзен ...ударныя рэйкі. Фонды павінны быць ...ораны ў бліжэйшыя дні поўнасьцю ...у калгасах, таксама і ў аднаасоб...м сэктары.

...одахват насеньня і фуражу па ...ен быць пакрыт за кошт мабілізаўнутраных мясцовых рэсурсаў, за ...т калгасьнікаў і асабліва тых но...к калгасьнікаў, якія пры ўступлень ...ў калгас павінны ў абавязковым па...ку ўносіць свой насенны і фураж...фонды.

...ругім надзвычайна адстаючым вуткам падрыхтоўкі да сяўбы зьяўляецца кантрактацыя яравых. Лічбы ...кананьня пляну кантрактацыі яра...к на 5 красавіка паказваюць, што ...раве кантрактацыі яшчэ не надана ...тежная ўвага. Плян кантрактацыі ...культур на 5 красавіка выканан на ...проц., бульбы—22,7 проц. і зерня...х культур—31,7 проц.

...акое становішча стварае пагрозу ...ячасоваму выкананьню пляну кан...трактацыі. Апартуністычная недаацэн...свячасовага давядзеньня пляну ...трактацыі да мас, адсутнасьць гібі...ці ў радзе зьвеньняў апарату, ад...насьць масавай работы сярод кал...ьнікаў і бядняцка-серадняцкай ма...сы—аднаасобнікаў—зьяўляецца асноўнай прычынай несваячасовага выкананьня пляну кантрактацыі да вызначанага тэрміну. Гэты ўрок павінен быць улічан. Справа кантрактацыі павінна быць узьнята на належную палітычную вышыню. Трэба рашуча змагацца з апартуністычнай недаацэнкай своячасовага правядзеньня кантрактацыі яравых. Кантрактацыя яравых павінна быць выканана ў вызначаны тэрмін. Вакол кантрактацыі павінны быць мабілізаваны шырокія калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы. Кожная ячэйка, кожны сельсавет павінны зьвяцца сапраўды баявым штабам на фронце правядзеньня кантрактацыі.

Адным з вузлавых пытаньняў падрыхтоўкі саўгасаў і калгасаў да веснавой сяўбы зьяўляецца правільная арганізацыя працы. Правільна арганізаваць працу ў саўгасе, калгасе—гэта значыць забясьпечыць посьпех веснавой сяўбы. Зьдзельшчына зьяўляецца рашаючай умовай правільнай арганізацыі працы. Увядзеньне зьдзельшчыны ва ўсіх калгасах па ўсіх асноўных відах работы павінна быць ажыцьцёўлена да 15 красавіка.

Зьдзельшчына стаіць у цэнтры ўвагі ўсёй калгаснай масы. Пераход на зьдзельшчыну паказвае з першых-жа дзён станоўчыя вынікі. Калгасная маса горача падтрымлівае зьдзельшчыну. Зьдзельшчына наносіць магутны ўдар па кулаку і яго агентах. Зьдзельшчына ўзьняла творчы энтузіязм калгаснай масы, узмацніе калгас, падвышае вытворчую дысцыпліну.

Побач з гэтым мы прымушаны канстатаваць, што і на гэтым вучастку на сёньнешні дзень справа стаіць не на належнай вышыні. Ня гледзячы на тое, што зьдзельшчына ва ўсіх асноўных работах павінна быць уведзена да 15 красавіка—яшчэ ня ўсе калгасы перайшлі на зьдзельшчыну. Кіруючыя калгасныя зьвеньні ў радзе месц плятуцца ў хвасьце мас. Творчы энтузіязм мас, парыў да зьдзельшчыну належна не скарыстоўваецца. Кіруючыя калгасныя органы павінны неадкладна на вярнуцца тварам да зьдзельшчыны.

Асабліва дрэнна ўнядраецца справа зьдзельшчыны ў саўгасах. Пераважная большасьць саўгасаў яшчэ і да гэтага часу практычна не прыступіла да ўвядзеньня зьдзельшчыны. Такому зьявішчу павінен быць пакладзен канец. Кіраўніцтва саўгасаў павінна неадкладна прыступіць да вырашэньня пытаньняў увядзеньня зьдзельшчыны з тым, каб да пачатку веснавой сяўбы пастановы VI зьезду саветаў ажыцьцявіць поўнасьцю. Вакол пытаньняў зьдзельшчыны павінны быць мабілізаваны шырокія саўгасныя масы рабочых.

Кулак на кожным сваім кроку імкнецца перашкодзіць, і ў радзе месц перашкаджае паасобным зьвеньням калгаснага руху. Вось чаму ад кожнай ячэйкі ад кожнага сельсавету, калгасу, асабліва зараз, патрабуецца пільнасьць да клясавага ворага.

Ударная бальшавіцкая работа на ўсіх вучастках падрыхтоўкі да сяўбы, жорсткая барацьба з кулацтвам і яго агентамі»правымі і «левымі» апартуністамі—павінны стаяць у цэнтры ўвагі ўсёй работы. Бальшавіцкая вясна павінна быць спаткана ўзброенымі сіламі новых сотняў калгасаў, арганізацыяй калгаснага прыліву, разгортваньнем далейшых тэмпаў суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на гэтай базе кулацтва як клясы.

Поўны правал антысавецкай інсцэніроўкі ў Варшаве

Закулісная рэжысура на-хаду мяняе ролю падсуднага—шпіка польскай дэфэнзывы Палянскага—з „ваеннага аташэ“ на „хрысьціяніна“... і „вар'ята“

Другі дзень судовай камэдыі

ВАРШАВА. 10-IV. Вялікія справаздачы, публікуемыя польскім друкам, аб працэсе Палянскага маюць адну і тую-ж мэту: змазаць сутнасьць справы і прадставіць Палянскага ня то крымінальным злачынцай, ня то «правакатарам савецкай службы».

Суд таксама усіляк стараецца абыходзіць палітычныя моманты бо працэс вядзецца, як звычайная крымінальная справа.

Пасьля дапросу камісара палітычнай паліцыі Галчынскага абарона ўносіць прапанову аб неабходнасьці выезду суда на месца злачынства «для дакладнага ўстанаўленьня ўсіх абставін справы, у прыватнасьці, устанаўленьня месца, дзе, паводле слоў Палянскага, быў перарэзаны электрычны провад». Прапанова абароны падтрымліваецца абвінавачаньнем.

Крыжаваным дапросам сьведак Махая і Галчынскага ўстанаўляецца—ня гледзячы на ўсе спробы Палянскага і яго абаронцаў адхіліць гэта—што электрычны провад быў перарэзаны Махаем ня ў трох мясцох, а толькі ў двух. Гэта адхіляе сьцьверджаньне Палянскага, нібы ён перарэзаў провад.

На першае пытаньне суда: ці мог пры даным прыладжваньні пякельнай машыны адбыцца выбух,—экспэртыза дае адказ: «так, выбух адбыцца мог». На другое пытаньне: якія разбурэньні зрабіў бы выбух,—экспэртыза адказвае: «выбух разбурыў бы сьценку таўшчыной 60 см. з радыусам дзейства выбуху ў некалькі мэтраў».

У адказ на адну з рэплік Палянскага экспэрты заяўляюць, што снарад быў бязумоўна прыгатаваны першарадным спэцыялістам гэтай справы.

Палянскі наёмны выканаўца...

ВАРШАВА. 10-IV. Цэнтральным момантам другога дню працэсу Палянскага была экспэртыза. Суд пасьпеў ужо выслухаць думку ўсіх экспэртаў. Экспэртыза ўстанавіла, што пякельная машына была пабудавана зусім мэтазгодна і выбух мог здарыцца. Порах быў ў здавальняючым стане. Снарад быў пастаўлены так, што набіты ім порах набываў уласьцівасьці падобныя да ўласьцівасьцяў дынаміту, хоць і з меншай сілай выбуху. Ударнік сканструяваны так, што выбух павінен быў адбыцца. Электрычная праводка была дастаткова для таго, каб выклікаць выбух. Недахоп у гадзінкавым мэханізьме, тлумачыцца тым, што мэханізм быў памяты ў часе дастаўкі яго экспэртам. У пытаньні аб магчымым дзеяньні выбуху, экспэрты выказалі некаторую стрыманасьць і паказалі, што сіла яго была-бы не надзвычайна вялікая. Экспэрт Абалчынскі заявіў, што паводле яго думкі, дом паўнаводнага прадстаўніцтва ня быў бы разбураны, маглі пацярпець толькі асобы, якія знаходзіліся-бы блізка ад месца выбуху.

Затым суд дапрашваў сьведак, выкліканых абаронай з мэтай ўстанавіць, нібы Палянскі падрыхтаваў замах выключна ў дэманстрацыйных мэтах. Усе сьведкі адхілялі дасьведчанасьць аб падрыхтоўцы Палянскім замаху. Толькі сьведка Лебедзеў заяўляе, што Палянскі гаварыў яму аб неабходнасьці стварэньня саюзу, які павінен дамагацца ў дзяржаў высылкі савецкіх пасольстваў.

Пасьля двух дзён працэсу Палянскага ўжо ёсьць некаторая магчымасьць ацаніць палітычны бок працэсу. Ужо зьнікла вера ў аб «камуністычнай дзейнасьці» Палянскага. Сьцьвярджаць гэта не адважваецца ні абвінавачаньне, ні абарона, ні сам Палянскі. Наадварот, Палянскага стараюцца прадставіць дурнем, мяккацелым хрысьціянінам. Што датычыцца фактычнага боку справы, дык суд адмовіўся ад версіі, што падрыхтоўваемы выбух быў толькі жартам і дэманстрацыяй. Канчаткова ўстаноўлена, што выбух меркаваўся ўсур'ёз. Ні для кога ўжо ў залі ня існуе сумненьняў, што Палянскі наёмны выканаўца чыёйсьці волі. Але пракурор і суд усяляк абмінае як-раз момант існаваньня супольнікаў і арганізацыі, накіраваўшай на гэту справу Палянскага, існаваньне якіх не адхіляе абаронца. Устаноўлены бясспрэчны факт, што гадзінкавы мэханізм быў у руху, ня выклікаў ніякага інтарэсу з боку пракурора. Між тым даведзена, што ўся праводка была скончана за тыдзень да таго, як яе выкрылі і праз некалькі дзён пасьля ад'езду Палянскага з Варшавы. Адсюль відаць, што быў чалавек, які пусьціў у рух гадзінкавы мэханізм, які заводзіцца толькі на 36 гадзін.

Пракурор палічыў за неабходнае млява даць запытаньне адкуль чэрпаў Палянскі сродкі на падрыхтоўку замаху. Сьведка—камісар палітычнай паліцыі заявіў, што Палянскі перад ад'ездам у Варшаву прадаў свой ложак за 15 злотых і радыёпрыёмнік. Між тым, нават паводле абвінавачэньня акту, на адну ўстаноўку пякельнай машыны Палянскі затраціў 175 злотых, ня лічачы выдаткаў на ўцяканьне ў Юга-Славію.

Характарна, што да крайнасьці цяжкае матар'яльнае становішча Палянскага ў некаторы перыяд, даведзенае мноствам сьведкавых паказаньняў, у апошнія часы перад замахам зьмяніліся ў бок паляпшэньня. Справа тоне ў малых падрабязнасьцях і нікому непатрэбных сьведкавых паказаньнях, накіраваных ў бок дасягненьня адной мэты: замазаньня палітычнай сур'ёзнасьці справы і выхалашчаньня палітычнага зьместу працэсу.

На данай стадыі працэсу міжвольна ўзьнікае небясьпека, што пасьля няўдач скарыстаць працэс у выключна правакацыйных мэтах, будзе зроблена спроба зрабіць яго ня сур'ёзным, сьме хатворным.

Падагульваючы вынікі першых двух дзён працэсу, неабходна падкрэсьліць што суд і пракуратура праяўляюць яўна тэндэнцыёзную бязуважнасьць да высьвятленьня сапраўдных акалічнасьцяў замаху.

Роля Палянскага зьменена з „ваеннага аташэ“ на „вар'ята“...

ВАРШАВА, 11-IV. На вячэрнім паседжаньні суду на другі дзень працэсу Палянскага ўпяршыню робіцца спроба асьцярожна працягнуць ўжо праваленую з трэскам вэрсію аб «службе Палянскага ў Савецкім пасольстве».

Сьведка абароны Лебедзеў расказвае, як быццам між іншым, што Палянскі служыў у «дыплёматычнай савецкай місіі» ня то ў Чарнавіцах, ня то ў Люблянах.

Другі сьведка Казаноўскі, якому Палянскі абяцаў даць ліст з рэкамэндацыяй ня то да прафэсара Штэйнаха, ня то Эйнштэйна паведамляе, што Палянскі расказваў аб сваёй службе ў якасьці «ваеннага аташэ у палпрэдстве СССР» ў Вене.

«Пясьля прыезду з СССР,—заяўляе сьведка на пытаньне старшыні,—убачыўшы сваімі вачыма, што там адбываецца, Палянскі рашыў канчаткова парваць з бальшавікамі і пакляўся помсьціць ім». Аднак, ня гледзячы на тое, што гэтыя моманты абвержаны нотай СССР і лістом Маркуса, старшыня суду ўсё яшчэ ня лічыць патрэбным агаласіць савецкую ноту і паказаньні Маркуса, каб раз і назаўсёды пакончыць з яўнай камэдыяй аб «бальшавіку Палянскім» і перайсьці да сапраўднага расьледваньня справы аб замаху на палпрэдства. Але суд, як відаць, менш за ўсё жадае заняцца гэтым расьледваньнем. Засталося дапрасіць яшчэ 8 сьведак, у тым ліку жонку Палянскага. Сёньнешнае паседжаньне пакажа, ці мае намер старшыня ў заключэньне судовага сьледзтва, так сказаць, пад занавес, усё-ж разыграць краплены козыр аб «савецкім і камуністычным мінулым» ужо выкрытага заядлага і здаровага контррозьведчыка Палянскага.

Нябачная, але моцная рука, якая рэжысыруе судовую камэдыю, адчуваецца ня толькі ў залі суду, але і паза яе, у першую чаргу, у друку. Характар заданьня, ускладзенага на суд, ня выклікае ўжо ніякіх сумненьняў. Гэтае заданьне складаецца з таго, каб наколькі магчыма, амаль правалены правакацыйны анты-савецкі бок справы і выцягнуць сухім з вады замаскаваць арганізацыю, якая стаяла за Палянскім. У гэтых адносінах работаюць у дружным кантакце суд, пракурор і абарона. Адсюль стараннае ўніканьне ўсіх пытаньняў, якія закранаюць контр-разведацыйнае мінулае Палянскага і ўсё тое, што магло-б навесьці на сьляды ўдзельнікаў падсуднага. Адсюль і апошні ратавальны мосьцік—вэрсыя аб «вар'яцтве» падсуднага, якое на дзіва адзінадушна разьвіваецца ўсім афіцыёзным друкам на чале з «Газэтай Польскай». Гэтым таксама тлумачацца старанныя спробы фармальна выгарадзіць Польшчу з усёй гэтай справы, для чаго ўпарта настойваюць, што Палянскі ня меў права на польскае подданства і ня спыняюцца нават перад абвінавачаньнем Палянскага ў атрыманьні грамадзянства «шляхам ашуканства».

„Сьвяты ўгоднік... з дэфэнзывы

МАЛ. М. АСОТА.

Ян Палянскі

Буржуазны друк аб Варшаўскім працэсе

ПАРЫЖ, 11-IV. «Папюлер» і «Эксцэльсіор» зьмяшчаюць паведамленьне агенцтва «Эйфармасіён» аб варшаўскім працэсе Палянскага. Газэты падкрэсьліваюць, што Палянскі імкнецца стварыць уражаньне, што ў яго не ў парадку розум.

***

ВЕНА, 10-IV. Камэнтуючы працэс Палянскага, «Арбэйтэр Цэйтунг» (орган сацыял-дэмакратаў) піша, што Палянскі зьяўляецца прафэсыянальным шпіёнам. «Стварэцца ўражаньне,—піша газэта,—што замах быў арганізаваны па пэўнаму заказу».

Арышты і сьмяротныя прысуды

Паводле паведамленьня з Харбіна, у японскім парляменце міністар замежных спраў Цдэхара паведаміў, што са сьнежня мінулага году на 10-га лютага бягучага году японскай коноульскай паліцыяй арыштавана ў раёне Цзяндао 1.300 чалавек па абвінавачаньні ў рэвалюцыйным руху. На падставе паведамленьняў з Мукдэна ў студзені і лютым лік пакаранных сьмерцю ў Цзяндао дасягае 200, а лік арыштаваных перавышае 2.500 чал.

НА БАЯВЫЯ РЭЙКІ

работу ашчадкас, камсодаў па мабілізацыі грашовых сродкаў

Камісія садзейнічаньня Менсампрамсаюзу, Белкалгасцэнтру, БДУ, Саюзтрансу, Дому Селяніна, Белпаляводсаюзу існуюць на паперы. Апартуністычную стаўку на самацёк замяніць бальшавіцкімі тэмпамі работы

Ажывіць работу камсодаў!

Бюро Скаргаў НК РСІ Бел., разам з рабочым актывам зрабіла налёт-праверку работы камісій садзейнічаньня па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады».

Налёт, які быў зроблены на 32 прад прыемствы, установы, фабрыкі і заводы, выявіў рад недахопаў.

Камісіі садзейнічаньня ў большасьці зьмен бязьдзейнічаюць, зусім не займаюцца работай, а існуюць толькі на паперы. Ня відаць работы па рэалізацыі пазыкі «5 у 4» (арцель «Аб'яднаньне», Менсампрамсаюз, Белкалгасцэнтр, сталоўкі МЦРК: 7, 10, 11 і г. д.).

Камісіі нядбайна адносяцца да распаўсюджваньня пазыкі «5 у 4» (БДУ, Саюзтранс, Дом Селяніна і г. д.), а на фабрыцы кухні разьмеркавацель зусім ня мае камісіі садзейнічаньня і нічкай работы па пазыцы не праводзіцца.

Прафарганізацыі зусім слаба дапамагаюць камсодам. Мясцком МЦРК ні якай работы не праводзіць. Сам старшыня мясцкому МЦРК т. Фрайд ніяких захадаў ня прымаў, а член камсоду тав. Русакоў адмаўляўся даваць зьвесткі аб рабоце камсоду і трымаў брыгаду «ЛК» 2 дні.

Камісія садзейнічаньня Белпаляводсаюзу пасьля выезду 2 членаў комсоду ў раён, зусім распалася і больш не абіралася. Ня гледзячы на тое, што член камсоду т. Лук'янчык ставіў некалькі разоў перад мясцкомам пытаньне аб выбарах камсоду, мясцком ніякіх мер ня прымяў. Старшыня МК БПС т. Рыжыкаў адносіцца да гэтай справы бюракратычна і нават пры праверцы брыгадай «ЛК» камсоду адказаў: «Прыдзеце пасьля работы, у мяне шмат спраў і, наогул, гэтыя абсьледваньні абрыдлі».

Такім чынам, работа камсоду праходзіць самацёкам і мясцком БПС ніякіх захадаў ня прымаў да яе ажыўленьня.

Шмат маецца такіх камсодаў, якія не ахапілі 100 проц. падпіскай ўсіх рабочых і служачых (Белдзяржвыдавецтва, БДУ, Дом Селяніна і інш.). Таксама ніякай работы камсоды не вядуць на дадатковую падпіску на пазыку «5 у 4», а там, дзе вядзецца работа, дык зусім слаба.

Парт'ячэйкі прафарганізацыі недастаткова зьвяртаюць увагі на работу камсоду і слаба дапамагаюць ім у рэалізацыі пазыкі «5 у 4». Некаторыя зусім ня кіруюць гэтай справай (Сампрамсаюз, Саюзтранс і г. д.).

У большасьці сваёй камсоды ня маюць вучоту ўкладчыкаў ашчадкасы і ніякай растлумачальнай работы не праводзяць. (БДВ, «Чырвоны Мэталіст», Першы групком Будаўнікоў і г. д.), а ў арцелі Мэтінструмант зусім ня маецца ўкладчыкаў ў ашчадкасу.

У галіне грамадзкага кантролю на продаж і заклад аблігацыі камсоды амаль што ў большасьці сваёй робяць скажэньні (НКЗ, завод «Полымя Рэвалюцыі» і г. д.), яны даюць дазволы асобам, выселеным па суду за межы БССР і ад'яжджаючым на вучобу і г. д.

Камісіі садзейнічаньня не займаюцца своячасовай праверкай ўнясеньня ўносаў адміністрацыяй у банк па пазыцы. Наогул, камсоды ў сваёй штодзённай рабоце пытаньнем мабілізацыі сродкаў не займаюцца.

Таму бюро скаргаў НК-РСІ Бел. канстатавала, што камісіі садзейнічаньня па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады» бязьдзейнічалі, а прафарганізацыі ў сваёй большасьці стаялі ў баку (арцель «Аб'яднаньне», Дом Селяніна, Саюзтранс, Менсампрамсаюз, Кухня разьмеркавальнік), ня прынялі ніякіх захадаў да рэалізацыі пазыкі «5 у 4».

Шмат устаноў і прадпрыемстваў не ўцягнулі рабочых і служачых на 100 проц. падпіску на пазыку (БДУ, Белдзяржвыдавецтва, Дом Селяніна і г.д.), а таксама работа па дадатковай падпісцы не праводзіцца.

Адсутнічае праверка амаль што ва ўсіх камсодах, наколькі своячасова на гашаюцца выданыя ссуды па пазыках.

Бюро скаргаў прапануе камсодам ў двухдзённы тэрмін ахапіць усіх рабочых і служачых 100 проц. падпіскай, а таксама і ўсіх нанова паступаючых рабочых і служачых.

Таксама Бюро Скаргаў пастанавіла зазначыць усім партыйным, камсамольскім, прафэсыянальным арганізацыям аб неабходнасьці іх удзелу ў рабоце камсодаў і ажыцьцёўць лепшае кіраўніцтва работай камсоду з тым, каб склад камсодаў быў запоўнены лепшымі ўдарнікамі рабочых і служачых.

Фабрыкі і заводы, якія шэфствуюць над установамі, павінны ўзмацніць рабочы кантроль за дзейнасьцю камсодаў. Усю работу камсодаў ўзяць пад пралетарскую самакрытыку, праз насьценгазэты больш асьвятляць работу камсодаў.

Бюро Скаргаў НК-РСІ Бел. запрапанавала ўсім прафарганізацыям перагледзець склад камсодаў тых арганізацый, дзе работа адсутнічае і ўзмацніць работу там, дзе яна праводзіцца слаба. Далей Бюро Скаргаў пастанавіла заслухаць даклады камсодаў на мясцкомах і агульных сходах рабочых і служачых аб праробленай імі рабоце і аб ролі і значэньні камісіі садзейнічаньня.

Работу камсодаў пераключыць на мэтады сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Правесьці праверку і наладзіць вучот выданых ссуд і своячасовага іх пагашэньня. Камсоды павінны тэрмінова прыняць захады да ліквідацыі запазычанасьці па пазыцы «Пяцігодка ў чатыры гады».

Бюро Скаргаў ўлічыўшы тое, што ў некаторых камсодаў маюцца скажэньні ў рабоце прамадзкага кантролю, прапануе камсодам прапрацаваць інструкцыю і палажэньне аб грамадзкім кантролі і сыпналізаваць перад ад наведнымі органамі аб скажэньнях.

Таксама прапануецца Гаркамісіям садзейнічаньня звярнуць больш увагі на жывое кіраўніцтва і больш сыстэматычна правяраць работу і інструктаваць пізавыя камсоды.

Усе камсоды павінны тэрмінова выпрацаваць пляны сваіх работ уключыўшы ў плян работы пытаньне ўцягненьня ўкладчыкаў у ашчадкасы. Работа па ўцягненьні ўкладчыкаў павінна сыстэматычна праводзіцца, кантраляваць, на што павінна быць зьвернута ўвага Гаркамсоду.

Камсоды павінны скарыстаць тыраж выйпрышаў па пазыцы «5 у 4» для больш пасьпяховага яе распаўсюджваньня, шляхам арганізацыі праверкі выйпрышаў па свайму калектыве і выдачы гэтых выйпрышаў на апульных сходах, прысьвечаных пытаньням мабілізацыі сродкаў на сацыялістычнае будаўніцтва.

А. Фандарэнка.

Беларускае кіраўніцтва сувязі зрывае мабілізацыю сродкаў

На працягу доўгага часу ашчадныя касы пры паштовых установах у большасьці сваёй бязьдзейнічаюць. Шмат разоў кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыту БССР зварачвала ўвагу Беларускага кіраўніцтва сувязі на неабходнасьць ужыцьця захадаў па ўзмацненьні работы ашчадкас, але кіраўніцтва сувязі, спасылаючыся на адсутнасьць адказнага працаўніка, ня прымала ніякіх захадаў для наладжваньня гэтай справы.

Улічваючы надзвычайную важнасьць паштовых ашчадкас (колькасьць якіх складае 50 проц. агульнай колькасьці кас па БССР), кіраўніцтва ашчадкасамі БССР перадала ў распараджэньне кіраўніцтва сувязі кваліфікаванага работніка па ашчадсправе. Але адміністрацыя Беларускага кіраўніцтва сувязі перакінула гэтага работніка на іншую работу (на тэлефонную станцыю).

Зараз гэтая справа зноў бяспрытульная, зараз, як і раней, ніхто ашчадсправай не займаецца. Між тым, маюцца катэгарычныя пастановы ўраду, якія абавязваюць Беларускае кіраўніцтва сувязі прыняць самыя рашучыя захады да ўзмацненьня работы паштовых ашчадкас і выкананьня кантрольных лічбаў па мабілізацыі сродкаў. Беларускае кіраўніцтва сувязі гэтым самым садзейнічае зрыву пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва праз ашчадкасы.

П.

Падпісаліся на пазыку

Агульны сход сялян вёскі Ўзлогі, Хоцімскага раёну, пастанавіў падпісаць па пазыку «Пяцігодка ў чатыры гады» на 300 рублёў і выклікаў на сацспаборніцтва ўсе вёскі і калгасы Хоцімскага раёну.

Прахарэнка.

Ударыць па апартуністых

Вялізарнае значэньне мае мабілізацыя вольных сродкаў насельніцтва і зьберажэньняў праз ашчадкасы. Але райашчадкаса Чырвона-Слабодзкага раёну да апошняга часу не перабудавала сваёй работы на сапраўды бальшавіцкія тэмпы, толькі за апошні час адкрыта 4 прыпісаныя касы і зараз у гэтым напрамку разгорнута работа. Хоць вынікі пакуль што нязначныя, але адчуваецца ўрух у гэтай галіне. Даны адпаведныя дырэктывы па партыйнай і савецкай лініі аб аказаньні максымальнай дапамогі райашчадкасе пры пашырэньні пізавой сеткі.

Дрэнна абстаіць справа з хаваньнем каштоўнасьцяй і грошай ў пізавых карах па прычыне адсутнасьці хавальніц. Таксама адсутнасьць пячатак у прыпісаных ашчадкасах дрэнна адбіваецца на разьвіцьці ашчадсправы, бо з-за адсутнасьці пячатак бываюць некаторыя затрымкі ў выдачы пераводаў акрэдытываў.

Райпрафсавет, ня гледзячы на тое, што прафсаюзы сельгаслесарабочых, асьветы і саўгандлыслужачых заключылі сацумовы па вярбоўцы ўкладчыкаў у ашчадкасы, не актывізуе ролі апошніх і ніякага вучоту вынікаў гэтай работы ня маецца. Трэба адзначыць, што райпрафсавет у справе мабілізацыі сродкаў ніякага ўдзелу ня прымае.

За апошні час наглядаецца актывізацыя працы камсамольскіх ячэек па выкананьні саўдагавору па ўцягненьні ўкладчыкаў. Рэдакцыя газэты Чырвона-Слабодзкага раёну «Калгасьнік» зусім не асьвятляе на сваіх старонках пытаньняў мабілізацыі сродкаў і не зьмяшчае ў газэце маючыяся ў рэдакцыі матар'ял.

Трэба мабілізаваць усе сілы і грамадзкасьць для выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў. Трэба рашуча ўдарыць па тых, хто праяўляе правапартуністычную недаацэнку ролі і значэньня мабілізацыі сродкаў на сучасным этапе сацыялістычнага будаўніцтва.

Брыгадзір НКФ Пэрэльман.

Разгарнуць масавую работу па вярбоўцы ў АБВШ

Цэнтральная вярбовачная камісія і АБВШ праверылі ў радзе раёнаў Беларусі становішча вярбоўкі ў вайсковыя школы. Агульны вывад аб становішчы вярбоўкі зводзіцца да таго, што вярбоўка пастаўлена пад пагрозу зрыву. Мясцох да гэтага важнейшага палітычнага пытаньня падрыхтоўкі кадраў РСЧА дапушчаны апартуністычныя адносіны. Ні партарганізацыі, ні камсамол, ні савецкія органы і прафсаюзы гэтай справай пасапраўднаму не заняліся, а паклаліся на самацёк ступленьня заяў ад кандыдатаў у вайсковыя школы бяз ўсякага ўзьдзеньня на адбор іх і работу з імі.

Ня гледзячы на рад паказаньняў і дырэктыў партыйных і савецкіх органаў, у радзе раёнаў да гэтага часу не ганізаваны як вярбовачныя камісіі, к і курсы па падрыхтоўцы ў вайсковыя школы. На 6-месячныя курсы пры АБВШ па падрыхтоўцы ў вайсковыя школы да гэтага часу ня вылучылі ніводнага кандыдатаў—Менская, Гомельская, Бабруйская, Віцебская вярбовачныя камісіі. У Магілеве вярбовачная камісія была арганізавана гарадзкім саветам ТДА—Авіяхіму па-за ўдзелу зацікаўленасьці гэтай справай Савету Раённага выканаўчага камітэту. У Менскім гарсавеце маецца вылучаны старшыня вярбовачнай камісіі. Гэты старшыня ўжо 6 раз склікаў прадстаўнікоў прафсаюзаў, гарадзкога камітэту партыі, камсамолу і ні на воднае паседжаньне ,каб намеціць мерапрыемствы па вярбоўцы, гэтыя прадстаўнікі не зьявіліся.

Па радзе прадпрыемстваў гор. Менску («Кастрычнік», «Камунар» і інш.) і гэтага часу ня ведалі аб умовах паступленьня ў вайсковыя школы, аб нормінах набору, аб патрабаваньнях, якія падаюцца да паступаючых у тыя ці іншыя школы. Патрабавалася з боку АБВШ вылучыць брыгады з курсантаў, настаўнікага і камандзнага складу на ўсе прадпрыемствы па растлумачэньні зьместу вярбовачнай кампаніі.

Такім чынам, асноўнымі прычынамі зрыву вярбоўкі ў вайсковыя школы ў Беларусі трэба лічыць:

Па-першае—апартуністычныя адносіны, поўная палітычная недаацэнка вярбоўкі ў вайсковыя школы з боку радаў партыйных ячэек, ячэек камсамолу, прафсаюзных і савецкіх органаў.

Па-другое—што справа вярбоўкі ў вайсковыя школы не даведзена да прадпрыемстваў, да цэху, да саўгасу, калгасу і вёскі.

Па-трэцяе—што вакол вярбоўкі ў вайсковыя школы не разгорнута ніякай масавай работы.

Для ліквідацыі такога становішча справы вярбоўкі ў вайсковыя школы лічумоўна неабходна ўмяшаньне Цэнтральнага Камітэту партыі Беларусі, Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў і ЦК камсамолу з рашучым ударам па канкрэтных носьбітах апартуністычных адносін да справы вярбоўкі.

Партарганізацыі і ў першую чаргу гарадзкія камітэты партыі і раённыя камітэты павінны праверыць па раёне выкананьне дырэктыў партыі па падрыхтоўцы кадраў для РСЧА па лініі работы вакол вярбоўкі. Рашуча ўдарыць па тых настроях «што ня можам даць рабочых», бо такія настроі ні ў якай меры не ляжаць па лініі ўзмацненьня кадраў РСЧА. Трэба дабіцца ўсім зьместам палітычна-масавай работы, каб кандыдаты ў вайсковыя школы былі найлепшымі рабочымі, у масе сваёй ударнікамі і тэхнічна пісьменнымі.

Камсамол, які нясе вялізарную адказнасьць ня толькі за разгортваньне масавай работы вакол вярбоўкі, але і за вылучэньне з свайго асяродзьдзя лепшых кадраў камсамолу ўдарнікаў у вайсковыя школы, павінен з максымальнай сілай ліквідаваць прарыў і апартуністычныя адносіны, якія стварыліся ў сувязі з вярбоўкай у вайсковыя школы.

Па лініі садружства вайсковыя часьці таксама павінны вылучыць брыгады, дапамагчы вярбовачным камісіям у справе адбору і вярбоўкі рабочай моладзі на прадпрыемствах у вайсковыя школы. Менавіта на месцы растлумачыць палітычны сэнс вярбовачнай кампаніі бягучага году, адабраць на месцы лепшых кандыдатаў, разгарнуць з імі работу.

Вярбовачныя камісіі неадкладна павінны арганізаваць курсы па падрыхтоўцы ў вайсковыя школы, арганізаваць дакладны адбор па сацыяльным складзе кандыдатаў і зьвярнуць выключную ўвагу на фізічнае становішча, на агульную пісьменнасьць і выканаць тыя паказаньні па выкананьні раскладу, які даны партыяй і вярбовачнай камісіяй.

Час для вярбоўкі і работы з кандыдатамі вельмі абмежаваны. Калі партыйныя арганізацыі, савецкія, прафсаюзныя і камсамольскія органы ня зоймуцца па-сапраўднаму справай вярбоўкі, яны гэтым самым цалкам сарвуць укамплектаваньне вайсковых школ бягучага году. Толькі максымальна разгорнутай работай, праверкай і кіраўніцт

У паход за зьдзе льшчыну

15 КРАСАВІКА АПОШНІ ТЭРМІН

ПЕРАВОДУ УСІХ КАЛГАСАЎ БССР НА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ

ТРЫ ДНІ, якія засталіся для ўвядзеньня зьдзельшчыны па асобных паказьніках сельска-гаспадарчых работ, ператварыць у баявы ТРОХДЗЕНЬНІК ШТУРМУ прарываў у арганізацыі працы ў калгасах

УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ, АПЭРАЦЫЙНЫЯ ПАСТЫ, РАБСЕЛЬКОРЫ—НА ЛІНІЮ АГНЯ!

Факты галасуюць за зьдзельшчыну

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Калгас «Дзяржынскага» па раду галін працы перайшоў на зьдзельшчыну. У сувязі з гэтым маецца шмат дасягненьняў на ўзьняцьці працоўнай дысцыпліны, ліквідацыі прагулаў і інш.

Пераведзена таксама на норму выпрацоўкі і кузьня. У выніку рамонт інвэнтару і машын скончан датэрміново.

Маюцца посьпехі і па іншых галінах работы. Напрыклад: было вызначана зрабіць 12 пар драбін для калёс, 2 падушкі, насадзіць чацьвёра калёсаў, 10 калёсаў перацягнуць, зрабіць 12 аглабель, акаваць іх, падагнаць калёсы, зрабіць 12 пасьцельнікаў для калёс, 24 ручкі і інш. Для гэтага вызначана 50 працадзён. Работа павінна была быць скончана да 15 красавіка, але дзякуючы ўвядзеньню зьдзельшчыны, работа выканана на 10 дзён раней. Другі прыклад: да пераходу на зьдзельшчыну 2 калгасьнікі на лесазагатоўках апрацоўвалі 4 пні, а зараз, з пераходам на зьдзельшчыну, гэтыя-ж калгасьнікі павялічылі апрацоўку да 8-9 пнёў Тое-ж самае і па вывазцы лесаматар'ялу. Раней калгасьнік вывазіў па 2 бервяны, а зараз—па 3—4 і нават 5 на тую-ж адлегласьць.

На сходзе калгасьнікаў пастаноўлена перайсьці на зьдзельшчыну па ўсіх галінах работы.

Пасьля пераходу на зьдзельшчыну калгас «Чырвоны Сьцяг» дабіўся значных вынікаў па ўзьняцьці працоўнай дысцыпліны, павялічэньні прадукцыйнасьці працы, ліквідацыі прагулаў.

Шмат калгасьнікаў, якія раней сымулявалі, зараз сталі прыкладнымі працаўнікамі. Напрыклад, Гурэвіч: да зьдзельшчыны выпрацоўваў у месяц 16 працоўных дзён, а зараз, у сувязі з пераходам на зьдзельшчыну, выпрацоўвае 54 працадні ў месяц, гэта значыць павялічыў інтэнсыўнасьць працы больш чым у тры разы. Альбо Гурэвіч Соня, да пераходу на зьдзельшчыну наопул не выходзіла на работу, зараз выпрацоўвае 30 дзён.

Калгасьніца Плюшкова, якая даглядае за сьвінямі, раней выпрацоўвала 30 дзён, зараз—64 працадні.

Вялізарных посьпехаў калгас дасягнуў і па вывазцы лесаматар'ялу. Раней калгасьнік вывазіў лёс 6 раз, зараз пры той-жа адлегласьці спраўляецца вывезьці 9 і больш разоў.

У калгасе «Савецкая Беларусь» з увядзеньнем па некаторых галінах зьдзельшчыны поўнасьцю ліквідаваны прагулы, недысцыплінаванасьць, нявыхад на работу. Раней шмат калгасьнікаў спазьнялася на работу, а часам і зусім не хацелі выходзіць, зараз пры ўвядзеньні зьдзельшчыны, самі прыходзяць прасіць работы.

Да ўвядзеньня зьдзельшчыны 18 цялят даглядалі 3 калгасьніцы, а зараз даглядае 2; раней для дойкі кароў было вызначана некалькі жанчын, а зараз гэтыя жанчыны выконваюць сваю норму работы на іншай галіне і спраўляюцца даіць кароў. Прадукцыйнасьць працы па вывазцы лесаматар'ялу падвоілася.

Зараз у калгасе выпрацоўваюцца нормы па пераходу на зьдзельшчыну па ўсіх галінах гаспадаркі. Да пачатку вясновай сяўбы калгас пераходзіць выключна на зьдзельшчыну.

А. Нёманскі.

Раўняйцеся па Сараг оўскім сельсавеце

СЛУЦАК. (Наш кар.). Сарагоўскі сельсавет, Слуцкага раёну, за апошні час значна пасунуўся наперад у сэнсе калектывізацыі і падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны.

На сёньняшні дзень калектывізавана 58 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак, а да пачатку вясновай сяўбы сельсавет узяў курс давесьці процант калектывізацыі да 75.

Сельсаветам створаны вярбовачныя брыгады з калгасьнікаў беднякоў, якія з вялікім энтузіязмам узяліся за работу і дасягнулі добрых вынікаў. Брыгады здолелі наладзіць шырокую растлумачальную работу, у выніку чаго штодзённа паступаюць заявы аб уступленьні ў калгас беднякоў і сераднякоў, як пасобна, так і калектыўна.

Праведзена шмат сходаў калгасьнікаў сумесна з аднаасобнікамі. На сходах шырока папулярызаваны пастановы партыі і ўраду па калектывізацыі.

6 красавіка на канфэрэнцыі актыву сельсавету з удзелам настаўніцтва і калгасьнікаў былі заслуханы рапарты старшынь калгасаў аб гатоўнасьці да сяўбы і вынікі работы вярбовачных брыгад. Ставілася таксама пытаньне аб увядзеньні ў калгасах зьдзельшчыны, на якую перайшлі ўжо многія калгасы.

На гэтай-жа канфэрэнцыі была падана калектыўная заява 17 бядняцкіх гаспадаран аб уступленьні ў калгас.

Вялікі ўдзел у калектывізацыі і падрыхтоўцы да вясновай сяўбы прымае настаўніца в. Рыбак т. Дубіцкая. У гэтай вёсцы калектывізавана 75 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак. У процілегласьць ёй настаўнік в. Круглае Гусак, які прыстроіўся на кватэры заможніка Бандарэя, зжыўся з ім і ніякага ўдзелу ў розных кампаніях ня прымае. Ніводная гаспадарка з вёскі Круглае няма ў калгасе. Члены сельсавету гэтай вёскі бяздзейнічаюць.

Сарагоўскі сельсавет выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва Амговіцкі і Мялешкаўскі сельсаветы. Галоўным пунктам сацыялістычнай умовы зьяўляецца пасьпяховая падрыхтоўка да вясновай сяўбы, прынцыпе актыўнага ўдзелу ва ўвядзеньні зьдзельшчыны ў калгасах, як адзінага правільнага шляху арганізацыі працы і зьнішчэньня рэшткі кулацтва, і 100-процантны ахоп бяднякоў - сераднякіх гаспадаран калгасамі.

Па Сарагоўскім сельсавеце павінны раўняцца ўсе іншыя сельсаветы Случчыны.

А. Курдо.

У бліжэйшую дэкаду красавіка скончыць кантрактацыю яравых

Мала-Сітнянскі сельсавет паказаў прыклад ударнай работы

Полацак. (Наш карэсп.). Першыя дні красавіка не далі патрэбнага зруху ў правядзеньні кантрактацыі на Полаччыне. Па калгасах закантрактавана: зярнёвых—49 проц., бульбы—58 проц., гародніны—52 проц., садоў—44 проц.

Горш абстаіць справа з кантрактацыяй па аднаасобным сэктары. Тут такуль-што панае бяздзейнасьць. Зярнёвых закантрактавана па аднаасобных гаспадарках толькі 2 проц. пляну, бульбы—4 проц. і гародніны каля 2 проц.

Мала гэтага. Больш паловы сельсаветаў дагэтуль зусім не падаюць весткі аб ходзе кантрактацыі па аднаасобных гаспадарках. Трэба лічыць, што ў гэтых сельсветах зусім не разгарнулася работа на правядзеньні аднаго з важнейшых мерапрыемстваў партыі і Савецкай улады. Рад сельсаветаў тармозіць справу кантрактацыі, не праводзячы адначасова афармленьня дагавораў з кантрактантамі. Замест таго, каб адразу-ж пасьля правядзеньня сходаў па кантрактацыі заключаць дагаворы, сельсаветы адкладаюць выкананьне гэтае работы на цэлыя тыдні.

Такія выпадкі назіраюцца па Махіраўскім, Тураўлянскім, Семянецкім, Экіманскім і інш. сельсаветах.

Арлейскі і Громаўскі сельсаветы зусім не разгарнулі работы па кантрактацыі. Па Арлейскім сельсавеце на сёньняшні дзень нічога ня зроблена па кантрактацыі, а старшыня Громаўскага сельсавету ўсё адкладае сходы па абгаварэньні кантрактацыі пасеву.

Але маюцца і добрыя прыклады работы. Мала-Сітнянскі сельсавет, які нядаўна цягнуўся ў хвасьце па ўсіх кампаніях, зараз, дзякуючы ўдарнай рабоце актыву, дабіўся значных посьпехаў у рабоце. Сельсавет некалькі месяцаў таму назад меў толькі адзін калгас, у які ўваходзіла 24 гаспадаркі. У дэкаду сталінскага заклику калгас пашырыўся да 69 гаспадарак. Апроч таго, арганізаваны новы калгас «Бальшавіцкі заклік», у які ўва ходзіць 26 гаспадарак. Бядняцка-сераднякіх гаспадаркі сельсавету калектывізаваны на 32 проц. Калектывізацыя працягваецца такімі-ж тэмпамі ў сувязі з адозвай III Усебеларускага зьезду калгасаў.

Па сельсавеце заканчваецца правядзеньне кантрактацыі пасеву. Плян кантрактацыі выкананы на 80 проц.

Падрыхтоўка да сяўбы па гэтым сельсавеце праходзіць добра. Насеньня фонды створаны і ачышчаны, с.-г. інвэнтар адрамантаваны.

Толькі зараз на Полаччыне ўзарушыліся ў правядзеньні кантрактацыі пасеву. Арганізацыі пастанавілі палкам скончыць кантрактацыю ў працягу першай дэкады красавіка. Райком КСМ накіраваў у 4 сельсаветы буксірную камсамольскую брыгаду, якая ўключылася ў генэральную праверку падрыхтоўкі да сяўбы і павінна практычна дапамагаць на месцах выкананьню пляну кантрактацыі.

Але гэтых мерапрыемстваў яшчэ недастаткова. Плян кантрактацыі на Полаччыне будзе выкананы толькі тады, калі на гэтую справу мабілізуецца ўвесь актыў самих сельсаветаў, калі пасобныя сельсаветы зьяўляць апартуністычныя адносіны да кантрактацыі, калі партыйныя ячэйкі на мясцох забясьпечаць чоткае партыйнае кіраўніцтва.

Гэтага трэба дабіцца і ў першую дэкаду красавіка трэба палкам скончыць кантрактацыю яравых пасеваў.

Баз. Румянец.

ПЕРАМОЖНЫЯ КРОКІ

Абвяшчаем сябе ўдарнікамі

У памяшканьні школы калгасу «Перамога» не адчувалася сібернасьці зімовага надвор'я. Адбываўся агульны сход калгасьнікаў. На партах, на сталох, на падаконьніках сядзелі калгасьнікі, уважліва слухаючы даклад пра падрыхтоўку да другой бальшавіцкай сяўбы. Дакладчык, прадстаўнік райкал гасаюзу, гаварыў ня доўга. Больш га варыў старшыня калгасу т. Сысоеў. Ён канкрэтна спыняўся на калгасным пляне пасеўкампаніі і мэтадах яго ажыцьцяўленьня.

— Нам неабходна засеяць сёлетняй вясной,—гаварыў старшыня калгасу,—ня менш 15 га жыта, 10 га аўсу, 4 га ячменю, 20 га бульбы, 18 га вікі, 8 га сланэчніку і 13 га канюшыны. Пры гэтым варта мець на ўвазе, што наш калгас мае садова-гародніх напрамак і па гэтую галіну мы павінны асабліва пад націснуць. Пад гародамі будзе занята каля 40 га ды пад парнікамі 2 га...

Тав. Сысоеў абмаляваў плян будучых вясенніх работ і сваю прамову заключыў коратка і зразумела:

— Выкананьне гэтага пляну залежыць ад самих калгасьнікаў пры ўмове найшырэйшага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва па сяўбе, пры ўмове нашай арганізаванасьці і дружнасьці!...

— Верна гаворыць старшыня,—пера гаворвалася паміж сабой калгасьнікі.

— Яно так, зразумела, і павінна быць...

Да моўшыхся ўдарнікаў першым далучыўся каваль Карэвін. Ён заявіў:

— Я і мой памощнік Всіпёнак, абвяшчаем сябе ўдарнікамі па рамонту інвэнтара. Абяцаем скончыць рамонт калгаснага інвэнтара праз два тыдні і распачаць потым рамонт для аднаасобнікаў...

Усе калгасьнікі віталі ініцыятыву Карэвіна, перанятага калектыўным асяродзьдзем.

Сьледам за Карэвіным цераз некалькі дзён абвясьцілі сябе ўдарнай брыгадзе плотнікаў з 13 асоб. У догавары з плотнікамі суседняй камуны «Чырвоная Зорка» прадугледжана пабудова аборы да пачатку веснавых работ з тым разьлікам, каб потым усе сілы кінуць на палі, на выкананьне пляну другой бальшавіцкай.

Ударніцтва не застаецца на паперы:

— Абсясьцілі сябе ўдарнікамі, значыцца, і патрэбна спраўдзаць гэтую гонаровую назву, не падкачаць перад камунарскай брыгадай,—напамінае частка старэйшы брыгадзір плотнікам.

Ударніцтва сярод калгасьнікаў дае эфэкт. Плотнікі, ня гледзячы на жорсткасьць сёлетняй зімы, ня гледзячы на моцныя маразы, будавалі абору на 200 галоў. Калі раней заўважаліся з боку асобных плотнікаў прагулы, дык пасьля заключэньня ўмовы на сацыялістычнае спаборніцтва сьвядомасьць кожнага члена брыгады не дазваляла без уважлівай прычыны ня выйсьці на работу.

Даёш брыгады і зьдельшчыну!

У калгасе «Перамога» аб'яднана каля 40 гаспадарак. Гады два таму назад тут быў зусім малы нацыянальны ўрэйскі калгас.

— Сярод нашых шэрагаў не павінна быць нацыянальнай зваді,—сказалі пе радавыя калгасьнікі.

—І беларускі, і польскі, і ўрэйскі бядняк ці сярэдняк. аддаены нашай агульнай мэце, не зьяўляецца нашым ворагам.

Шэрагі калгасьнікаў вырасьлі, пацоўніліся сьвежымі сіламі. Таму асабліва сёлета з набліжэньнем такой адказнейшай рашаючай кампаніі, як калгасная сяўба, выпікла неабходнасьць сталай арганізацыі працы, сталага разьмеркаваньня абавязкаў паміж калгасьнікамі.

— Тым больш патрабуецца самая правільная арганізацыя нашай працы, —заначыў тав. Сысоеў на сходзе, пры сьвечаным падрыхтоўцы да сяўбы і ўвядзеньню зьдзельшчыны,—што ў нас мала рабочай сілы. Кожная працоўная адзінка павінна быць улічана і скарыстана з найбольшай мэтазгоднасьцю...

Сакратар камсамольскай ячэйкі тав. Шыхман, жывы энэргічны малады рабочы, прысланы мэталістамі з горараду на калгасную работу, падпрымоўваў старшыню. Шыхман вызначыў напрамак дзейнасьці калгасьнікаў.

— Мы павінны арганізаваць сталыя брыгады калгасьнікаў па асобных гаспадарчых галінах. Брыгадам патрэбна заключыць паміж сабой умовы на сацспаборніцтва. І тады вось справа пойдзе такім парадкам, які якраз і патрабуецца...

І калгасьнікі, дэталёва абгаварыўшы гэтае пытаньне разьмеркавалі абавязкі. Створана пяць брыгад: па паляводзтву, жывёлагадоўлі, гароднінству і інш. галінах. Кожнай брыгадай кіруе выпрабаваны недаючы даручаную справу калгасьнік. Старэйшых брыгадзіраў сход вызначыў з такіх калгасьнікаў, якія карыстаюцца аўтарытэтам, маюць арганізатарскія здольнасьці і добра знаёмы з вядзеньнем гаспадаркі. Скажам, Таранкоў—старэйшы брыгадзір па паляводзтву. Таранкоў ніколі ня хістаўся, ня сумняваўся ў карыснасьці тэй мэты, да якой вядзе калектыў. І калі Таранкова агульны сход вылучыў старэйшым брыгадзірам, дык ён шчыра бяз выкрутасаў адзначыў:

— Тое, што мне даручаюць калгасьнікі, будзе заўсёды выкананa. У гэтым не сумняваўся...

Па пытаньні ўвядзеньня зьдзельшчыны асаблівых спрэчак сярод калгасьнікаў ня было. Калгасьнікі віталі зьдзельшчыну, як мерапрыемства, якое нясе з сабой зьнішчэньне абыякавых адносін да работы, зьнішчэньне лодыр ніцтва, павышэньне інтэнсыўнасьці і разам з гэтым дапамагаючае выкананьню пляновых наметак.

— Вылучыць брыгады, гэта ня значыць скончыць расстаноўку сіл,—гаварылі на сходзе,—кожнай брыгадзе, кожнаму калгасьніку патрэбна да заданьне на кожны дзень...

І цяпер калгасьнікі ўжо маюць ро мы выпрацоўні, зацьверджаныя агульным сходам, маюць арганізаваныя брыгады, маюць тое, што патрэбна для правядзеньня сяўбы на-бальшавіцку. Таму надыход вясны не палохае калгасьнікаў.

Праверка баявой гатоўнасьці

У калгасным кузьні цэлы дзень ідзе ўпартая работа. Ударнікі Карэвін і Всіпёнак апраўдваюць сваю назву. Ра мэнт сельска-гаспадарчы інвэнтар, патрэбны на час сяўбы. Каля кузьні выстройваюцца плугі, бароны, калёсы. Чуюцца рытмічныя ўдары молатоў. Пырскае асьвятляючы агнёвымі іскрамі весёлую музыку, распаленае жалезо.

— Сяўба недалёка, марудзіць з ботай ня прыходзіцца,—заўважае Всіпёнак і на твары, запэцканым сажай, захоўваецца клапатлівасьць сапраўдага гаспадара.

— Мы ўжо скончылі рамонт калгаснага інвэнтара,—гаварліва дадае Карэвін—і цяпер рамантуем інвэнтар аднаасобнікаў. Матар'ялаў вось толькі ня ху не хапае...

Ды ня толькі кузьня спраўляецца з сваім заданьнем. Цягавая сіла таксама ўпарадкавана. Ачышчанае насеньне жыць гатовым пасьпацца з соялкі і чорную глыбока ўзьнятую тлустую зямлю, Адсыпаны і страхавы фонд ня ўсякі выпадак неўрадлівасьці. Плугі, бароны, калёсы, сельска-гаспадарчыя машыны стаяць над паветкай адрэмонтаваныя, вычышчаныя, пафарбаваныя.

Улічыўшы папярэднія вынікі апрыхтоўчае работы па сяўбе праўленьне калгасу вызначыла наладжваньне пробнага выезду на поле, ведаючы што пробны выезд, як люстэрка адбіе ўсе бакі гатоўнасьці сустрэчы сяўбу. Загадзя да выезду сярод калгасьнікаў праведзена растлумачальная работа, пытаньне пробнага выезду гаворана на вытворчай нарадзе.

Дзень пробнага выезду стаў сьвятам, дэманстрацыяй калгасных сілаў. Ніцою калгасьнікі запрагалі коняй, выхаліся вакол сялак, рыхтавалі касы. Намалёваныя вучнямі лёзунгі і каты рознакалёрнасьцю вялізных літараў напаміналі аб задачах пробнага выезду. Хвалюючыся аддавалі і распраджэньні старэйшыя брыгадзіры. Хоць і ляжаў белымі пушыстымі ванамі сьнег на палёх, а ўсё-ж адчувалася быццам-бы калгасная грамада выжыдае сапраўды праводзіць у чыстую першую баразну на абагулых нівах.

— Ці ня сьнег яны думаюць узараць?—зьдзіўляліся праходзкія на гэ цінцы людзі.

— Гэта так званы пробны выезд, тлумачылі другія.

— Во замітуліліся галубкі, як-бы сапраўды араць едуць,—дзяліліся сваімі думкамі старыя вартаўнікі школы і вочы іскрыліся цёплай матчынай радасьцю.

Члены праўленьня разам з прадсе дніком райкалгасаюзу правералі гатоўнасьць мяркуючы па пробным выезьдзе, улічвалі кожны дробязны дэфэкт, які можа шкодна адбіцца на ходзе. Па сканчэньні-ж выезду правялі тут-жа на месцы лятучы мітынг. Падагульвалі вынікі пробы сіл.

— У апошнім наш калгас,—гаварыць старшыня калгасу,—падрыхтаваны сяўбы. Гэта паказаў сёньняшні пробны выезд. Але мы яшчэ не павінны біць заключэньне, што э падрыхтоўка скончана справа. Уся наша работа якую мы праводзім зараз і якую будзем праводзіць да вясны, зьяўляецца грунтам, забясьпечваючым посьпехі сеўкампаніі...

Насустрач новым перамогам

Беднякі і сераднякі трох нацыянальнасьцяй, стварыўшы адзіную сям'ю «Перамогі», заняты будаўніцтвам сацыялістычнага ладу. У тэмпі сярод дружнага калектыву выхоўваюцца новыя людзі, адданыя калгаснай руху, ломячы старыя традыцыі, вызначаючы адрыжкі далёкага мінулага.

Наколькі адчуваецца рост калгаснага сьведчаць хоць-бы сабе канкрэтныя лічбы атрыманьня прыбытку за мінулыя гады. У 1929 г., калі тут існавала невялічкі калгас, атрымана было прыбытку 2395 рублёў 40 капеек. 1930 г. затое даў прыбытку 61736 руб. У сярэднім на кожнага калгасьніка выпадае менш 420 рублёў. Гэта лічба, якая ва ўмовах Полаччыны ніколі не дасягаецца на аднаасобнай бядняцкай серадняцкай гаспадарцы.

Пераапрацоўваецца і псыхолёгія былых сялян, раней даражыўшых уласным хутаркам больш за ўсё на сьвеце. У мінулым годзе аднойчы здарыўся выпадак антысэмітызму. Тэрэшкі былу скліканы калгасны сход і калгаснікі ўсёй грамадой асудзілі ганебны ўчынак, яскрава заявіўшы:

— Антысэмітам, гэтым агентам кулацтва ворага ня месца сярод калгаснікаў...

Устаноўка зразумелая. І людзі пранацый жывуць аднымі ідэямі, аднэй працаю, аднымі мэтамі. Кожны ведае чаго дабіваецца і чаго можна дабіцца будуючы калектыў. У жыцьці калгаснікаў маецца шмат выпадкаў канкрэтнай пераапрацоўкі людзей, шмат яскравых казчыкаў таго, пры якіх умовах мена віта забясьпечваецца посьпех змагання за сацыялістычную будучыню. І гэтае лепшае мы бярэм як вопыт для практыкі другіх.

Разьвіцьцё і рост «Перамогі» яшчэ наперадзе. Але і цяперашняе станоўшча дае повад к таму, каб сказаць, што калгас упарта і правільна пераможнымі крокамі ідзе насустрач новым заваёвам на фронце перабудовы сельскай гаспадаркі.

Тарас Хадкевіч.

Поунасьцю пераводзім работу на зьдзельшчыну

Узьнімем 10га цаліны, пашырым плошчу засеву

РЭД. ГАЗ. „САВ. БЕЛАРУСЬ"

Мы, брыгада калгасу «Бальшавік», Рамязоўскага сельсавету, створаная для пасьпяховага правядзеньня вясновай пасеўнай кампаніі, абавязуемся поўнасьцю выканаць прыняты плян пасеву і зрабіць раскарчоўку цаліны ў 10 га, якая зьявіцца павялічэньнем плошчы засеву супроць вызначанага пляну.

Мы поўнасьцю пераводзім сваю работу на нормы выпрацоўкі і зьдзельшчыну; будзем весьці барацьбу з гуль тайствам і безгаспадарчасьцю. Мы дапаможам таксама нашаму рабсельпраўскаму пасту выявіць усе дадатныя банкі, а таксама хворыя зьявішчы калгасу і брацьбе апошнія на грамадзкі бун кір.

Дамо рашучы адпор кулацкай агітацыі супроць нормы выпрацоўкі. Пабальшавіцку правядзем 2-ю бальшавіцкую калгасную вясну і дапаможам пабудаваць да канца трэцяга рашаючага году пяцігодкі асновы фундаманту сацыялізму.

Ельскі раён.

Брыгада: СЫЧ А., ДУДКОЎСКІ, ЦІМАШЭНКА, ПАНЯК, БАРУШКА, СУРАВЫ, ТРАШКО Ц., СТАРАВОЙТ, БАБРУЙКА І, БАРДАШЭВІЧ, ШАЎЦОЎ А., БАБРУЙКА П., ТРАШКО.

Пастановы VI зьезду Саветаў і новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку—у масы

Па ўсіх насельных пунктах Камаравіцкага сельсавету, Петрыкаўскага раёну, праведзены агульныя сходы, на якіх распрацоўваліся пастановы VI зьезду Саветаў на калгасным будаўніцтве. Зараз праводзіцца растлумачэньне новага закону па сельска-гаспадарчым падатку на 1931 год.

У выніку такой растлумачальнай работы маецца новы прыліў у калгасы.

Пост газэты «Сав. Беларусь» А. ПЯЛІНСКІ.

За ўдарную працу ў калгасе выступае брыгада селькораў газэты „Савецкая Беларусь"

Мы, брыгада селькораў газэты «Савецкая Беларусь» з калгасу «Чырвоны Сьцяг», Магілеўскага раёну, ухвалялем мерапрыемствы па ўвядзеньні зьдзельшчыны і абвяшчаем сябе ўдарнікамі другой бальшавіцкай. Толькі праз зьдзельшчыну можна палепшыць працу ў калгасах, здаць больш хлебных яшкаў дзяржаве і палепшыць сваё новішча кожнага калгасьніка.

Брыгада: Альхавік Я., Данілін Т., Філімонаў П.

Праводзім масавую праверку падрыхтаванасьці да сяўбы

КРЫЧАЎ. (Наш кар.). Крычаўскія раённыя кіруючыя арганізацыі арганізавалі з 1 да 10 красавіка штурмавы дзесяцідзёньнік па ліквідацыі прарываў па падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі і 10 красавіка—раённы спробны выезд у поле. Для правядзеньня ўсёй гэтай работы былі мабілізаваны 100 чалавек раённага актыву.

Ужо ў першыя дні работы дэкадніка штурму назіраюцца новы прыліў у калгасы. Асаблівую ўвагу зварочвалі брыгады на папулярызацыю рашэньняў VI зьезду Саветаў і адозвы III Усебеларускага зьезду калгасаў. На 1-га красавіка ў раёне было ахоплена калгасамі 2.470 бядняцка-сераднякіх гаспадарак, што складае 39,1 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак раёну.

Збор насенных і страхавых фондаў у старых калгасах заканчан поўнасьцю, новыя калгасы адстаюць у гэтым мерапрыемстве. Ёсьць выпадкі, калі заможнікі, пралезшы ў калгас, тармозяць абатуленьне насенных фондаў і асноўных сродкаў вытворчасьці. Насеньне ачышчана на 65,1 проц.

Горш абстаіць справа з рамонтам інвэнтара. Каравальскія арцелі не спраўляюцца з выкананьнем задач рамонту.

Семянкоў.

Пераканаліся ў перавагах калектыўнай гаспадаркі

Беднякі і сераднякі х. Вярхі і Забалоцьце, Стара-Высоцкага сельсавету Ельскага раёну, перакананыяся ў перавагах калектыўнай гаспадаркі, арганізаваліся ў калгасы, назваўшы іх «Новыя Вярхі» і «Чырвоная Зьмена».

Назіраецца значны прыліў і ў існуючыя калгасы.

Чашэль.

Расце калгасны рух

У сувязі з надыходам антывялікодной кампаніі, беднякі і сераднякі в. Карпілаўкі, Глускага раёну, пад кіраўніцтвам мясцовых партыйных арганізацый, арганізавалі з 52 гаспадарак новы калгас пад назвай «Чырвоны Дабраахвотнік».

Арганізоўваючы гэты калгас, вёска абвясьціла сябе ўдарнай у выкананьні ўсіх мерапрыемстваў партыі і ўраду, каб гэтым самым узмацніць абароназдольнасьць СССР ад нападу буржуазіі. Пры калгасе арганізаваны ячэйкі «Бязбожнік» і «Асоавіяхім».

Калгасьнікі в. Карпілаўкі выклікаюць астатнія вёскі Акцябрскага сельсавету, у якіх няма яшчэ калгасаў, узяць з іх прыклад і ў самым хуткім часе арганізаваць калгасы.

Зараз у калгасе праводзіцца поўнае абатуленьне насеньня, сельска-гаспадарчага інвэнтару кармоў.

Н. С. Кудасоў.

Прыклады ўдарнай работы

Подрыхтоўчая работа да вясновай пасеўкампаніі па Гарэліцкім сельсавеце, Пухавіцкага раёну, праводзіцца ўдарнымі тэмпамі. Пытаньне аб вясновай пасеўкампаніі ставілася на 53 агульных сялянскіх сходах, дзе, галоўным чынам, завастралася пытаньне на калектывізацыі.

Шырокая папулярызацыя рашэньняў VI Усесаюзнага зьезду саветаў па пытаньнях калгаснага будаўніцтва ў вёсках Гарэлец, Кабылічы, Пясчанка, Ліпнікі і Ліпску выклікала магутную хвалю калгаснага руху. На сёньняшні дзень арганізавана 2 новых калгасы, і ў калгас «Белкаапсаюз» улілося 15 новых гаспадарак, а таксама заснавана 15 ініцыятыўных груп па арганізацыі калгасаў.

Плян сяўбы і кантрактацыі даведзен ужо да кожнага двара і калгасу на 100 проц. і даны цьвёрдыя заданьні кулацкім гаспадаркам. Плян сяўбы і кантрактацыі тэхнічных культур, лёну і канапель перавыкананы на 10,5 проц. Па лініі камітэту ўзаемадапамогі для 40 бядняцкіх гаспадарак загатоўлена насеньня аўсу 190 пудоў, ячменю 40 пуд. і абменена на гатункове 200 пуд. Па сельсавеце плян ачысткі насеньня перавыкананы на 15,5 проц. Рамонт машын па сельсавеце праходзіць здавальняюча, арганізаваны 3 майстэрні і на сёньняшні дзень адрамантавана плугоў 120, бароў 50, калёс 115. Таксама сабрана попелу 185 пудоў і вапны 60 тон.

Шэляг.

ЗА ПРАВІЛЬНЫ КАЛГАСНЫ ВУЧОТ

«Сацыялізм—гэта вучот», казаў Ленін: «Вучот і кантроль за колькасьцю працы і за разьмеркаваньнем прадуктаў—у гэтым сутнасьць сацыялістычнай перабудовы, калі палітычнае панаваньне пралетарыяту створана і забясьпечана».

Значэньне вучоту зараз зусім ясна кожнаму сьвядомаму калгасьніку. «Калі мы жадаем мець моцныя калгасы, калі мы жадаем, каб гаспадарка калгасаў сапраўды расла з дня на дзень, дык бяз вучоту мы гэтага не дасягнем, бо бяз вучоту калгасная гаспадарка аказваецца менш прадукцыйнай, чым яна магла быць. Калгасьнік не скарыстоўвае ўсіх тых магчымасьцяй уздыму, якія дае буйная аграмаданная гаспадарка, бяз вучоту людзі заблытваюцца ў складанасьці буйнай гаспадаркі» (з дакладу т. Якаўлева на VI Усесаюзным зьезьдзе Саветаў). Зараз усё пытаньне заключаецца ў тым, як больш мэтазгодна паставіць гэты вучот у калгасе.

Трэба сказаць, што калгасы ў гэтай галіне да апошняга часу вельмі адставалі. Усе сыстэмы вучоту, якія ўжываліся ў іх, яшчэ станоўчых вынікаў не давалі, бо самыя формы вытворчасьці, самаарганізацыя працэсу работы, форма і спосаб разьмеркаваньня даходаў і г. д., толькі цяпер набываюць устойлівы і яскравы характар.

Вучот у калгасах да гэтага часу ня толькі не пасьпяваў за гаспадарчымі працэсамі, але нават не спрабаваў да іх прыстасавацца. З усёй рашучасьцю трэба сказаць, што тая падвойная сыстэма бухгальтэрыі, якая ў свой час прышчапілася сельска-гаспадарчай кааперацыі, зусім не адпавядае як самым арганізацыйным формам і тэхнічным кадрам калгасаў, так і новым гаспадарчым працэсам у калгасах.

Падвойная бухгальтэрыя мае ў сваёй аснове і ставіць сваёй галоўнай задачай складаньне так званых бухгальтарскіх балянсаў. Паколькі ў калгасе разьлік ідзе на працягу году ў працадзёнах, паколькі працадні да канца году ня могуць быць ацэнены ў грашовым выразе, гэта адзіны бухгальтарскі балянс становіцца да канца году абсалютна немагчымым.

Большасьць калгасных рахункаводаў увесь час з'тэтым момантам ня лічылі ся. Яны па старой традыцыі ўсё-ж такі выводзілі бягучыя і гадавыя балянсы, расстаўляючы працадні ў грашовай форме.

Гэтае зьявішча прыводзіла да раду шкодных вынікаў: у радзе калгасаў калгасьнікі пачалі разглядаць запісныя рублі як зарплату і як запазычанасьць ім з боку калгасаў. Адсюль настроі быццам яны зьяўляюцца наёмнымі рабочымі, а калгасы дзяржаўным прадпрыемствам. Часткова не гэтай глебе разьвівалася шкодна-спажывецкія ўтры манцкія настроі сярод калгасьнікаў. На справе-ж калгасьнік—гэта гаспадар і таму ніякай зарплаты ў калгасе атрымоўваць ня можа. Такім чынам вучот па падвойнай сыстэме ў адносінах да кантролю і праверкі аказаўся ня толькі непрыемлым, але нават і шкодным.

Выданыя асноўныя палажэньні працьцейшага фінансавага вучоту ў калгасах, прынятыя НКЗ і Калгасцэнтрам СССР, рашуча для ўвядзеньня ва ўсіх калгасах; яны зьяўляюцца вынікам глыбокага вывучэньня практыкі вучоту і прапрацоўкі вучоту ў калгасах. Прапануемая сыстэма простага рахункаводзтва поўнасьцю адпавядае запатрабаваньням калгаснага будаўніцтва; яна найбольш даступна для ўсіх калгасьнікаў і ў гэтым яе каштоўнасьць перш за ўсё.

Першы аб'ект вучоту—гэта грашовы зварот (усе грашовыя паступленьні, як грашовыя выдаткі па касе па бягучых рахунках). Пры гэтай форме любы калгасьнік, любая рэвізыйная камісія, любая брыгада можа праверыць выдаткі па супасьці і супаставіць запіс у кнігах з адпаведнымі дакумантамі, у той час, калі падвойная сыстэма гэтай магчымасьці не давала. Для большасьці калгасьнікаў падвойная бухгальтэрыя была «граматай за 7-ю пячаткамі» і давала магчымасьць асобным рахункаводным працаўнікам часта бескантрольна рабіць усякія злачынствы.

Другі аб'ект—гэта вучот маемасьці, тавараў, прадуктаў і матар'ялаў. Па новай сыстэме, прапанаванай НКЗ і Калгасцэнтрам, гэты вучот грунтуецца на мэтазгоднай дэцэнтралізацыі, г. зн. кнігі вядуцца непасрэдна ў кладовых, складах і тых мясцох, дзе ўтварэцца зварот з гэтымі таварамі, прадуктамі і матар'ялам. Зразумела, што такі парадак вядзеньня вучоту стварае і некаторыя цяжкасьці, бо ня кожны калгасьнік на сёньняшні дзень зьяўляецца пісьменным, але ў кожным калгасе магчыма знайсьці такіх асоб, якія прайшла тую ці іншую школу ў гэтым напрамку ў радох Чырвонай армії і на практыцы больш-менш знаёмы з гэтай справай.

Трэці аб'ект зьяўляецца самай важнай часткай у новай сыстэме—гэта вучот працы: тут новая форма вучоту прадугледжвае вучот зьдзельнай работы на аснове плянавага разьмеркаваньня і скарыстаньня калгаснай сілы ў калгасе, вучот працы выключна па колькасьці і якасьці яе, выражанай у працадзёнах. Пры гэтым важнейшым патрабаваньнем правільнага вучоту работы павінна быць сваячасовасьць запісаў.

У гэтых адносінах у калгасах існаваў і яшчэ цяпер існуе вялікі беспарадак і блытаніна: працадні не заўсёды запісваюцца пасьля сканчэньня работы калгасьнікамі, дзякуючы чаму атрымліваецца блытаніна ў разьлічках, а часам і розныя злоўжываньні; у шмат якіх выпадках гэтыя запісы рабілі напамяць.

Новы парадак і формы вучоту работы дадуць поўную магчымасьць наблізіць самы працэс вучоту праз брыгадзіра да калгасьніка, чым будзе забясьпечана сваячасовасьць і правільнасьць запісаў. Зразумела, што гэта ўскладае на брыгадзіра вялікую адказнасьць за дакладнасьць запісаў, па трабуе ад яго дасканалага азнаямленьня з нормамі выпрацоўкі і характарам выкананай

БАН--ЦЭНТРАЛЬНЫ ШТАБ

усёй навукова-дасьледчай працы ў БССР

Канцэнтрацыя навукова-дасьледчай працы і падрыхтоўка навуковых кадраў

Узьнятае Беларускай Акадэміяй Навук пытаньне аб канцэнтрацыі навукова-дасьледчай працы навакол БАН —зьяўляецца зараз падзойна актуальным і прыцягваючым да сабе шырокі грамадзкі інтэрас.

Мы лічым, што такая пастаноўка пытаньня цалкам адпавядае тым дырэктывам нашай партыі, якія знайшлі адбітак у пастанове ЦК УсеКП(б) ад 15 сакавіка 1931 года па дакладу прэзыдыуму Камуністычнай Акадэміі.

Канцэнтрацыя навукова-дасьледчай работы ў БССР пад адным кіраўніцтвам ня толькі — шлях для зьяўленьня існуючага разброду ў навуцы, але гэта адзіны шлях для перабудовы работы навукова-дасьледчых устаноў БССР «такім чынам, каб была забясьпечана яшчэ больш цесная сувязь навуковай работы з актуальнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва і клясавай барацьбы пралетарыяту і хутчэйшай ліквідацыі адставаньня навуковай думкі ад практычнай работы партыі». (З рэз. ЦК УсеКП(б).

Апошні час, пасьля сьпіталізацыі з боку партыі аб адставаньні тэарэтычнай думкі ад практыкі сацыялістычнага будаўніцтва, работнікі навукі ў большасьці сваёй застаюцца яшчэ ў стане ўсьведамленьня і прызнаньня гэтага адставаньня, у стане рэакцыі аб неабходнасьці пералому, замест таго, каб на ходу перабудавацца ў бок распрацоўкі «канкрэтных вузлавых праблем, зьвязаных з бягучымі задачамі партыі і пралетарыяту, са ўступленьнем у перыяд сацыялізму і з задачай выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады на аснове рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, з задачамі культурнай рэвалюцыі і, у цэлым, з клясавай барацьбой сусьветнага пралетарыяту на даным этапе». (З рэз. ЦК УсеКП(б).

Прычынай асаблівага адставаньня тэарэтычнага фронту ў БССР, прычынаю незаменнай навуковай працы ў нас у меншай меры зьяўляецца недастатак навуковых сіл, як вынікае іх скарыстаньне і існуючы паралелізм у рабоце навукова - дасьледчых устаноў пры недахопе навуковых кадраў.

Існуе надзвычай многа даводаў, многа фактаў, якія гавораць на карысьць самага хутчэйшага правядзеньня ў жыцьцё думкі аб канцэнтрацыі адзінага кіраўніцтва навукова-дасьледчай працы. Многа важкіх даводаў усё прыводзілася ў друку пэрэтам навуковых працаўнікаў на карысьць такой канцэнтрацыі. Асаблівы грунтоўнае асьвятленьне знайшло гэтае пытаньне ў артыкулах і гутарках прэзыдэнта БАН тав. Горына, якія былі зьмешчаны ў «Зьвязьдзе» і «Савецкай Беларусі».

Мы хочам застанавіцца на пытаньні вялікай практычнай важнасьці і зьвязаць яго з канцэнтрацыяй навукова-дасьледчай працы ў БССР. Я маю на ўвазе пытаньне падрыхтоўкі навуковых кадраў. Сувязь гэтых двух пытаньняў—канцэнтрацыі і падрыхтоўкі навуковых кадраў—бясспрэчная, фактычна гэта адна праблема. Нельга гаварыць аб умацаваньні і павароце тэарэтычнага фронту да рэвалюцыйнай практыкі, без падрыхтоўкі маладых вучоных, узброеных марксыцка - ленінскай тэорыяй. А паміж іншым яшчэ да недаўняга часу ў падрыхтоўцы кадраў панавала стыхійнасьць, якую сабе дзяжка ўявіць і якая часта межавала на ат са шкодніцтвам. Шкодніцтва гэта выражалася ў тым, што ў многіх выпадках рыхтавалі ў «вучоных» не таго, каго нам трэба і не так як нам трэба, не для нас а супроць нас. Напрыклад, у такіх установах як былая БАН былы НДІ с. г. падрыхтоўка навуковых кадраў знаходзілася ў руках нацдэмаў. Акрамя гэтага некаторыя навукова - дасьледчыя ўстановы БССР зусім не рыхтавалі кадраў і ў гэтых адносінах ня мелі людзкай базы для росту. Там, дзе асьпірантура была, якасная падрыхтоўка яе была падзвычай нізкай, асабліва ў справе аўладаньня марксыцкай мэтадалёгіяй. Даючы асьпіранту якую колеч мізерную падрыхтоўку па спэцыяльнасьці, лічылі лішняй тратай часу займацца вывучэньнем дыялектычнага матар'ялізму. Рыхтаваўся тып ня новага, а старога вучонага. Сярод асьпірантаў 3-хгадзічнікаў, якія павінны зараз перайсьці да самастойнай навуковай працы, мы сустракаем людзей не значных марксыцкага мінімуму, што па сутнасьці адзначае—людзей палітычна ня дісьменных, вузкіх эмпірыкаў — кошт якім у сучасны момант невялікі. Некаторых такіх асьпірантаў, прабыўшых 3 гады ў асьпірантуры, замест наданьня годнасьці навуковага працаўніка прыходзіцца здымаць з асьпірантуры, як непагодных для навуковай працы.

З ліку існуючай зараз асьпірантуры па БССР для некаторых ву частвуе навукі рыхтуецца больш чым на сягоняшні дзень трэба, а па некаторых зусім ня рыхтуецца, альбо рыхтуецца вельмі мала. Для прыкладу пры ведзем такія факты:

а) па літаратуры недахоп людзей на сёняшні дзень—4 чал. рыхтуецца 14 чалавек;

б) па тэарэтычнай эканоміі—недахоп 24, рыхтуецца 6;

в) па тэхнічнай спэц.—недахоп—29, рыхт.—13;

г) па глебазнаўству — недахоп—9, рыхт.—2 і г. д.

Ускрыцьцё такога становішча з падрыхтоўкай навуковых кадраў прыняла ўвагу кіруючых партыйных і савецкіх органаў, запатрабавала ад іх непасрэднага ўмяшаньня ў гэтую справу. І калі ў справе навукова-дасьледчай працы на сёняшні дзень становішча застаецца не ўпарадкаваным, то ў справе падрыхтоўкі кадраў гэтая ўпарадкаванасьць у значнай ступені ўжо дасягнута.

Першым і буйнейшым дасягненьнем у гэтай справе зьяўляецца арганізацыя па пастанове ЦК КП(б)Б і ўраду інстытуту Асьпірантуры пры Акадэміі навук. Інстытут аб'яднаў «бясспрытульную» асьпірантуру большасьці менскіх навуковых устаноў пад адзіным кіраўніцтвам. На сёняшні дзень інстытут Асьпірантуры налічвае 183 асьпірантыі больш чым на 40 спэцыяльнасьцях. Першы і буйнейшы вынік гэтай канцэнтрацыі асьпірантуры выразіўся ў тым, што ўся гэтая колькасьць асьпірантаў ахоплена сэмінарамі па вывучэньні дыялектычнага матар'ялізму, працае над аўладаньнем марксыцка-ленінскай мэтадолёгіяй. Гэта зьяўляецца вялікім крокам уперад у параўнаньні з падрыхтоўкай у мінулыя гады. Але гэтым яшчэ не абмяжоўваецца справа падрыхтоўкі асьпірантаў. Побач з наладжаньнем марксыцкай падрыхтоўкі асьпірантаў неабходна таксама забясьпечыць спэцыяльную падрыхтоўку.

Арганізацыю інстытуту асьпірантаў трэба разглядаць як пачатак канцэнтрацыі і ўпарадкаваньня ўсёй тэарэтычнай работы ў БССР. Толькі так. За гэтым павінна пасьледаваць фашучая перабудова ўсіх навукова-дасьледчых устаноў. Згрупаваньне сіл і кадраў, а ня іх распыленьне.

Беларуская Акадэмія Навук павінна зьяўляцца кіруючым цэнтрам навукова-дасьледчай работы ў БССР. Праект рэарганізацыі і канцэнтрацыі Акадэміі ставіць сваёй мэтай арганізацыю моцных інстытутаў па цэлым шэрагу спэцыяльнасьцей, аб'яднаўшы ў іх усе тэарэтычныя, матар'яльныя сродкі і навуковыя сілы. Арганізацыя такіх інстытутаў адкідае недасьпеку аб адрыве тэорыі ад навукова-дасьледчай працы і падрыхтоўцы кадраў. Значыць, асьпірантуры не ў ліквідацыі інстытуту асьпірантаў а ў пашырэньні далейшай канцэнтрацыі навукова-дасьледчай работы навакол БАН. Гэтае мерапрыемства зьяўляецца надвойна палітычным і вынікае з задач нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Што гэта так, сьведчыць праходзячая зараз у Маскве Усесаюзная Канфэрэнцыя па пляніраваньні навукова-дасьледчай работы. Менавіта таму, у падыходзе да гэтага пытаньня нельга цярпець вузка-ведамственнага інтарэсу. Мы не настолькі багаты, каб разбазарваць сродкі і сілы па саматужных навуковых майстэрнях, але мы маем дастаткова сродка і сіл, каб ужо зараз стварыць моцную фабрыку пралетарскай навукі і паставіць яе на службу сацыялістычнага будаўніцтва.

Ів. Чарнецкі.

Аб канцэнтрацыі мэдычнай навукова-дасьледчай працы ў БАН

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 15 сакавіка г. г. па дакладу прэзыдыуму Кам. Акадэміі завастрыла ўвагу ўсіх навуковых работнікаў на прарывах навукова-дасьледчай працы. «Этап за вярнэньня фундамэнту сацыялістычнай эканомікі патрабуе перабудовы ўсёй навукова-дасьледчай працы, падпарадкаваньня яе строгай плянавасьці, стварэньня шматлікіх кадраў навуковых работнікаў-камуністаў і асабліва перамаганьня, зазначанага тав. Сталіным, адставаньня навуковай работы ад пражыкі сацыялістычнага будаўніцтва».

У мэдыцыне ня менш, як у другіх галінах навукі, адчуваюцца недахопы, аб якіх гаворыцца ў пастанове ЦК. Есьць і бязьплянаваасьць, паралелізм у працы і гэта ня гледзячы на недахоп навуковых работнікаў. Навуковая праца адстае ад сацыялістычнага будаўніцтва. Таксама і ў ёй «буржуазны ўплыў адбіўся ў форме шарагу анты-марксыцкіх і рэвізыяністкіх тэорый». Мы тут вызначаем і ідэалізм, і віталізм, і вульгарызацыю, і механістычны і наіўны рэалізм, поўзучы эмпірызм, практыцызм і эклектызм. Патрэбны рашучыя мерапрыемствы для барацьбы з самадзёяньнем, саматужніцтвам у навуцы. Працэсы індустрыялізацыі і калектывізацыі, мэтады пабудовы сацыялізму павінны знайсьці свой адбітак і ў арганізацыі навуковай працы. Саматужніцтва, працу вышадковую, у адзіночку, трэба зьмяніць на вышэйшыя формы работы. Для аб'яднаньня і найлепшага скарыстаньня ўсіх мэдычных навуковых сіл для «тэарэтычнай прапрацоўкі праблем сацыялістычнага будаўніцтва і клясавай барацьбы пралетарыяту» неабходзен адзіны аўтарытэтны кіруючы навукова-мэтадолёгічны цэнтр, які павінен плянаваць усю навуковую працу і сунуўшы ў гэтым узьняць яе да вышыні сацыялістычнага будаўніцтва.

Калі былая БАН з яе падпадпарадкаванымі і ілжэнавуковымі «катадраміі» і габінетамі ня зьяўлялася аўтарытэтным навуковым цэнтрам, дык яна вязак усіх навуковых работнікаў БССР, адданых сацыялістычнаму будаўніцтву, згуртаваца вакол сучаснай акадэміі і ператварыць яе ў сапраўдную цытадэль сацыялістычнай навукі. Але пры гэтым неабходна напрадзіць найважнейшую небясьпеку—адарваць навуковую працу ад штодзённага жыцьця. Мэдычныя навукова-дасьледчыя інстытуты зьяўляюцца арганічнай часткай Н. К. Аховы Здароўя. Яны выконваюць адказную апэрацыйную працу ў галіне аховы здароўя і адпаведна вырашаюць навукова-практычныя праблемы, якія перад імі ставіць ведамства. Адсэтуль вынікае неабходнасьць сьпісла ўвязаць працу БАН у навуковым плянаваньні і кіраўніцтве мэдычнай навуковай працай з НКАЗ і ў кіруючы цэнтр навуковай мэдычнай працы пры БАН увесьці прадстаўнікоў, зацікаўленых ведамстваў і савецкай грамадкасьці.

На якіх навукова-дасьледчых і навукова-практычных установах павінен будавацца адзіны навукова-дасьледчы «інстытут сацыяльнай, экспэрымэнтальнай і клінічнай мэдыцыны БАН», альбо каралей: «Навукова-дасьледчы інстытут Аховы Здароўя БАН»? Зразумела, ён павінен ахапіць усе мэдычныя ўстановы, у якіх вядзецца навукова-дасьледчая праца, не пасягаючы на іх апэрацыйную самастойнасьць, якой працягвае кіраваць як і раней НКАЗ. Для зьмяшчэньня паралелізму ў працы, трэба надаць інстытуту такую структуру, якая ўвязала-б у адзіным сэктары комплексы сваякіх галін мэдыцыны. Так, трэба ў інстытуце мець прыблізна наступныя сэктары, альбо аддзяленьні:

1) Сэктар сацыяльнай і прафілактычнай мэдыцыны на базе інстытутаў сац. гігіены, сан. ліг. інстытуту і інстытуту мікрабіялёгіі.

2) Сэктар экспэрымэнтальнай мэдыцыны на базе навуковых лябараторый і катадраў нармальнай анатоміі, гісталёгіі і фізыялёгіі Мэд. ін-ту НКАЗ. У гэтым сэктары можна ўвязаць і эмбрыялёгію і антрапалёгію.

3) Сэктар патолёгіі і клінічнай мэдыцыны на базе мовных навукова-дасьледчых лябараторый патолёгічнай фізыялёгіі, пат. анатоміі Мэд. ін-ту, сухотнага ін-ту НКАЗ і найбольш прадаўзольных навукова - дасьледчых аддзяленьняў клінік НКАЗ.

4) Псыхаэрэлёгічны сэктар, які ўразумела цалкам ключае работу па вышэйшай нэрвовай дзейнасьці. Гэты сэктар базуецца на мовных лябараторых навукова-дасьледчага інстытуту нэўралёгіі, фізыятры і артэзіяны НКАЗ, на габінэце па ўмоўных рэфлексах БАН, на лябараторыі псыхіятрычнай клінікі.

5) Сэктар працы з базай у добра абсталяваных навуковых лябараторыях інстытуту аховы працы.

6) Сэктар аховы маці і дзіцяці, які грунтуецца на інстытуце грудного дзіцяці, на лябараторыях дзіцячай клінікі.

Зразумела, наметка гэта толькі прыблізная. Але для таго, каб ахапіць усю навуковую працу ў галіне мэдыцыны, неабходна ўключыць у навукова-дасьледчы інстытут аховы здароўя пры БАН усе памянёныя ўстановы НКАЗ. Як і ў інстытуце прамысловасьці, таксама і ў мэдыцынскіх установах НКАЗ вядзецца значная апэрацыйная праца і на жмені лячэбна-прафілактычнай і санітарна-гігіенічнай і па падрыхтоўцы кадраў. Але ў іх, побач з гэтым, вядзецца яшчэ і вялікая навукова-дасьледчая праца, якую неабходна канцэнтраваць, плянаваць, падпарадкаваць пацыялістычнаму будаўніцтву. А гэта магчыма толькі тады, калі іх уключыць у інстытут сацыяльнай, экспэрымэнтальнай і клінічнай мэдыцыны БАН, забясьпечыўшы ўдзел у кіраўніцтве і за НКАЗ.

М. Кроль.

НА СЯМІГАДЗІННЫ!

Бальшавіцкія тэмпы будаўніцтва сацыялізму, на базе ліквідацыі эксплёататарскіх клясаў, даюць магчымасьць савецкаму ўраду хутчэй праводзіць у жыцьцё палепшаньне эканамічных і культурна-бытавых умоў рабочае клясы.

Да X гадавіны Кастрычніка быў апублікаваны дэкрэт савецкага ўраду аб паступовым увядзеньні сямігадзіннага рабочага дня. У той час «левыя» і правыя апартуністы лічылі гэты крок партыі і ўраду дэмагогіяй.

Але жыцьцё перакуліла ўсю тэарэтычную хлусьню, такоама, як сучаснае імкненьне бядняцка-серадняцкіх мас вёскі да калектывізацыі разьбіла ўсе тэорыі, усе прароцтвы правых аб нямінучым правале калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як апошняй эксплёататарскай клясы ў нашай краіне, разьбіла ўсе імкненьні правых апартуністаў затрымаць шпаркія тэмпы сацбудаўніцтва.

Друкуемая сёньня ў нашай газэце пастанова Урадавай Камісіі пры СНК БССР аб пераходзе ў гэтым годзе на сямігадзінны рабочы дзень цэлага раду прадпрыемстваў, гаворыць за многае.

Гэта пастанова, у якой намечаны да пераводу па БССР 74 прадпрыемствы, паказвае розьніцу паміж дзьвюма сыстамамі ў сьвеце: капіталізмам і сацыялізмам. ё

У краінах капіталізму мы бачым зараз вялічэзны крызіс, шматмільённае беспрацоўе, а ў некаторых капіталістычных краінах мы назіраем зараз нават пераход да сыстэмы прымусовых прац без усялякай аплаты. Мы ўжо не гаворым аб звычайным зьявішчы—10-гадзінным працоўным дню. Усё гэта робіцца для наступу на матар'яльнае становішча рабочых, для падрыхтоўкі вайны супроць СССР.

У краіне будаўніцтва сацыялізму становішча зусім іншае. У СССР, у прыватнасьці ў БССР, як частцы адзінага Саюзу, мы маем магутны ўздым сацыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, поўную ліквідацыю беспрацоўя, нават вялікі недахоп рабочых рук. Зусім ясна, што хлусьня сусьветных імпэрыялістаў аб «прымусовай» працы ў Савецкім Саюзе праводзіцца для таго, каб замазаць існую чую сапраўды ў краіне капіталу прымусовую працу, эксплёатацыю.

Пераход цэлага раду прадпрыемстваў па БССР (Віцебск, Менск, Нова-Беліца, Гомель, Шклоў, Ворша, Магілеў і інш. гарады) на сямігадзінны рабочы дзень узьніме яшчэ больш энтузіязм рабочае клясы на зўладаньне тэхнікай, на ўзмацненьне барацьбы за выкананьне прамфінпляну другога кварталу трэцяга рашаючага году пяцігодкі, на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Пастанова

Урадавай Камісіі пры СНК БССР „па падрыхтоўцы правядзеньня 7-мігадзіннага рабочага дню“

27-III 1931 г. гор. Менск

Урадавая Камісія пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Перавесьці на 7-гадзінны рабочы дзень у 1931 г. наступныя прадпрыемствы прамысловасьці НКСнабу БССР:

Сьпіс № 2

прадпрыемстваў НКСнабу, якія падлягаюць пераводу на 7-гадзінны рабочы дзень у 1931 г.

Шчотачная фабрыка — гор. Менск—2 квартал, Шчотачная фабрыка—гор. Віцебск—2 квартал, млын Саюзхлеба—Гомель—3 квартал, Мясакамбінат—Менск—3 квартал, Мясакамбінат—Віцебск—3 квартал, Мясакамбінат—Магілеў—4 квартал, Жывёла-бойня г. Полацак—4 квартал, Жывёла-бойня гор. Бабруйск—4 квартал.

Старшыня Урадавай Камісіі Пушчын

Адказны Сакратар Гольдзінбэрг.

Пастанова

Урадавай Камісіі пры СНК БССР „па падрыхтоўцы правядзеньня 7-мігадзіннага рабочага дню“

27-III 1931 г. гор. Менск

Урадавая Камісія пры СНК БССР па падрыхтоўцы правядзеньня 7-гадзіннага рабочага дню, пастанаўляе:

1. Перавесьці на 7-гадзінны рабочы дзень у 1931 г. наступныя прадпрыемствы па рэспубліканскай прамысловасьці:

Сьпіс № 1.

прадпрыемстваў рэспубліканскай прамысловасьці:

Пашыровая фабрыка «Спартак» гор. Шклоў—2 квартал, пашыровая фабрыка «Профінтэрн» гор. Барысаў—3 квартал, друкарня «Камінтэрн»—Віцебск—2 квартал, завод «Краска цьвет»—Лоеў—3 квартал, канфэльна-скіпідарны завод—Нова-Беліца—3 квартал, лакапалітурны завод—Нова-Беліца—4 квартал, фанэрны завод «Дняпро»—Рэчыца—2 квартал, фабрыка «Везувій»—Нова-Беліца—2 квартал, завод «Ільч» (шкляны)—Быхаўскі раён—2 квартал, завод «Ноўка» (шкляны)—Віцебскі раён—3 квартал, завод «Кастрычнік»—Сьвіслацкі раён—4 квартал, фабрыка «Двина»—Віцебск—2 квартал, завод «Чырвоны Мэталіст»—Віцебск—2 квартал, зав. «Чырвонае Адраджэньне»—Магілеў—2 квартал, зав. «Чырвоны Кастрычнік»—Ворша—2 квартал, завод імя Сталіна—Бабруйск—2 квартал, зав. «Рухавік Рэвалюцыі»—Гомель—2 квартал, зав. «Камінтэрн»—Віцебск—4 квартал, швэйная фабрыка «Камінтэрн»—Гомель—2 квартал, швэйная фабрыка «Профінтэрн» — Віцебск—3 квартал, Аўчына-шубная фабрыка—Гомель—2 квартал, Абутковая фабрыка—Гомель—2, Рымарна-сядзельная фабрыка—Магілеў—2 квартал, Лесазавод «Камінтэрн»—2 квартал, Лесазавод імя Томскага—2 квартал, Лесазавод «Сацыялізм»—2 квартал, Лесазавод «Чырвоны Папраніччнік»—2 квартал, Лесазавод «Адраджэньне»—3 квартал, Лесазавод імя Фрунзэ—3 квартал, Лесазавод імя Вароўскага—4, Лесазавод «Пралетары»—па скалч. рамонту.

Старшыня Урадавай Камісіі Пушчын

Адказны Сакратар Гольдзінбэрг.

Пастанова

Урадавай Камісіі пры СНК БССР „па падрыхтоўцы правядзеньня 7-гадзіннага рабочага дню“

27-III—1931 г. гор. Менск

Урадавая Камісія пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Перавесьці на 7-мігадзінны рабочы дзень у 1931 г. наступныя прадпрыемствы мясцовай прамысловасьці, пад парадкаваныя Райвыканкомам і Гарсаветам:

Сьпіс № 3 прадпрыемстваў РВК і Гарсаветаў, якія падлягаюць пераводу на 7-мігадзінны рабочы дзень у 1931 г.

Пераводзяцца ў другім квартале:

Эльвод—Менск, электрастанцыя—Віцебск, вода-сьвет—Гомель, электрастанцыя—Бабруйск, вяровачна-лямцавая фабрыка—Менск, фабрыка гнутай мэбл—Віцебск, войлачная фабрыка—Віцебск, лесазавод і калодачная фабрыка—Барысаў, лесазавод Прамтрэсту—Ворша, мэблева-мэтравая фабрыка—Магілеў, кандытарская фабрыка—Наўроўля, усе прадпрыемствы Гомсельгаспрому.

Пераводзяцца ў трэцім квартале:

Скурана - галянтарэйная фабрыка «Васход»—Менск, лесазавод № 3 Горкамбіната—Віцебск, рамонтна-тэсарны завод Горкамбіната—Барысаў, фабрыка ўпітазных дошак—Мазыр, мэблевая фабрыка Прамтрэста—Мазыр, мэблевая фабрыка «Халтурына»—Бабруйск, камбінірованая майстэрня — Бабруйск, лесазавод—Жлобін, лесазавод—Шклоў, сельска-гаспадарчыя рамонтныя майстэрні—Полацак, рымарная фабрыка—Гомель, панчошна-трыкатажная фабрыка—Гомель, лесазавод «Стайні»—Багушэўскага раёну, лесазавод—Гарадок

Пераводзяцца ў чацьвертым квартале:

Абутковая майстэрня—Менск, панчошна-трыкатажная «Чырвоны Тэкст,»—Менск, струмэнтальна-мэблевая фабрыка—Віцебск, абутковая—Горкамбіната—Віцебск, мэханічны завод Прамтрэсту—Орша, мукамольна-лесазавод «Зорка»—Магілеў, лесазавод—Койданава, лесазавод—Сураж, фабрыка «Кнімісі»—Гомель.

Старшыня Урадавай Камісіі Пушчын

Адказны Сакратар Гольдзінбэрг.

Другі этап культэстафэты

ШТУРМАВАЦЬ ПРАРЫВЫ

на фронце ліквідацыі няпісьменнасьці

Работу лікпунктаў і палітасьветустаноў падпарадкаваць задачам другой бальшавіцкай вясны. Вінаватых у зрыве ліквідацыі няпісьменнасьці ў Сьмілавіцкім, Жлобінскім і Ветрынскім раёнах—да адказнасьці

Вось як трэба змагацца

з ліквідацыяй няпісьменнасьці

«Дэкада штурму», якая ў свой час праводзілася, паказала, што ліквідацыя няпісьменнасьці ў Замшанскім сельтавеце, Борнавіцкі раён, стаіць на належнай вышыні.

Лікпунктамі па сельсавеце ахоплена 97 проц. няпісьменных. Лікпункты пачалі працаваць з 1-га лістапада і працуюць рэгулярна. На лікпунктах навучаюць ня толькі грамаце, але праводзіцца і палітыка-выхаваўчая работа: гутаркі, чыткі газэт і часопісаў, пастаноўка спэктакляў і г. д.

Быў зрыў у занятках (2 тыдні) з-за недахопу газы, але ўдарнай работай гэты зрыў ліквідаваны і праграмы заняткаў выконваюцца.

Працаўнікі лікпунктаў сельсавету на сваёй нарадзе вырашылі яшчэ больш увагі зьвярнуць на палітыка-выхаваўчую працу сярод няпісьменных, шырока разгарнуць мэтады сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж лікпунктамі. Нарада аднагалосна вынесла пастанову, каб зараз-жа ўсім ліквідатарам уступіць у калгасы і весьці растэмачальную работу ў ўдарнымі ў калгасы бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Абавязаліся ліквідатары і біцца за выкананьне задач 2-й бальшавіцкай вясны.

Нарада пастанавіла выклікаць на сацспаборніцтва на лепшае ажыцьцяўленьне пляну ліквідацыі няпісьменнасьці ліквідатараў Дзернавіцкага сельсавету.

К—вы.

Зрываецца навучаньне падлеткаў

у Ветрынскім раёне

Ня гледзячы на дырэктывы партыі і ўраду аб поўным ахопе навучаньнем няпісьменных падлеткаў 11—15 год, у Ветрынскім раёне выкананьне гэтай дырэктывы сарвана.

З вызначаных для Ветрынскага раёну 22 «камплектаў для падлеткаў працуе ня больш 5.

Тая буйны прарыў тлумачыцца тым, што ў пачатку навучальнага году раённы інспэктар асьветы т. Малінін замест таго, каб гэтыя 22 камплекты адчыніць пры школах, дзе ёсьць найбольшы лік падлеткаў, адчыніў 11 двохкамплектных школ у цэнтрах сельсаветаў. Такім чынам, школы адчынены там, дзе няпісьменных падлеткаў вельмі мала.

У выніку школы засталіся бяз вучняў, а падлеткі бяз школ. Інспэктар асьветы даў распараджэньне, каб у школы падлеткаў прымаць толькі тых, якія ўжо крыху пісьменныя, а няпісьменных зусім ня прымаць. Заўват настаўнікаў аб неправільным разьмяшчэньні школ інспэктар т. Малінін і слухаць ня хоча. «Мы далі ўстаноўку, а вы выконвайце,—гаворыць начальства. Адпаведным органам трэба неадкладна заняцца гэтай справай, бо інакш плян па навучэньні падлеткаў будзе сарваны.

Асьветнік.

Ліквідацыя ня пісьменнасьці сарвана

У вёсцы Палішана, Каменскага сельсавету, (Горацкі р-н), усеагульнае навучаньне і ліквідацыя няпісьменнасьці сарваны. Ня гледзячы на тое, што ў вёсцы маецца школа, пабудаваная на сродкі самаабкладаньня, у ёй дагэтуль няма настаўніка.

У выніку дзеці школьнага ўзросту засталіся па-за ўсеагульным навучаньнем. У вёсцы ёсьць шмат няпісьменных, але пра лікпункт такоама нічога ня чуваць. З пачатку навучальнага году ў школу прыслалі настаўніка, а ён праз некаторы час ушёк невядома куды.

Райінспэктарыят нарасьветы павінен прыняць тэрміновыя захады да таго, каб даць школе настаўніка. Л.

„Культэстафэта... гэта лішняя цеганіна“,—

разважаюць апартуністы з Сьмілавіцкага раёну

Партыйныя, камсамольскія, савецкія і грамадзкія арганізацыі Сьмілавіцкіх стаяць у баку ад другога этапу культэстафэты. Сьмілавіцкі РК ЛКСМ не мабілізаваў сваіх сіл на ліквідацыю прарыву па ўсенавучы, ліквідацыі няпісьменнасьці і палітэхнізацыі школ. Больш таго, з боку асобных членаў райкому назіраюцца правапартуністычныя разважаньні і недаацэнка справы другога этапу культэстафэты. Пасаобныя члены бюро райкому разважаюць так:—«Пастановы ЦК ЛКСМ нам не абавязнова пры стасоўваць да сваіх умоў, мы можам абыйсьціся і без культэстафэты. Гэта толькі лішняя цеганіна...» (?!)

На ліквідацыю прарыву на фронце культурнага будаўніцтва камсамольская армія не мабілізавана. У радзе месц раёну ліквідацыя няпісьменнасьці зрываецца; лікпункты не забясьпечаны падручнікамі, сшыткамі, лямпамі, газай, дзяжурыцы чаму некаторыя з іх спынілі работу.

Інспэктар нарасьветы т. Ламана нядбайна адносіцца да даручанай справы і не дапамагае паладзіць работу.

Асабліва дрэнна настаўлена работа па Дукорскім сельсавеце, у якім пытаньне культбудаўніцтва праластаўлена апартуністычнаму самацёку. Культэстафэта па сельсавеце правальваецца. Камсамольская ячэйка м. Дукоры бязьдзейнічае. Сакратар гэтай ячэйкі тав. Рэдзько адказвае — «ліквідацыя няпісьменнасьці, палітэхнізацыя школ і ўсеагульнае навучаньне ня справа ячэйкі, культэстафэта не для нас».

Пры сельсавеце арганізаваны штаб культэстафэты, але... кіраўнік штабу тав. Барыан нічога ня робіць. На запытаньне—чаму штаб бязьдзейнічае — ён адказвае,—«мы сваё зрабілі, а сельсавет няхай дарабляе, гэта яго справа».

Усе падаўзеныя факты сьведчаць аб тым, што ў Сьмілавіцкім раёне апартуністы ня здольны ўзьняць на належную вышыню пытаньняў культурнай рэвалюцыі, што яны цягнуцца ў хвасьце мас.

Адпаведным органам трэба рашучым чынам ударыць па апартуністах зрываючых справу культурнага будаўніцтва.

Брыгадзір «Сав. Бел.». Лявіцкі.

Зьнішчыць прарывы на фронце

ліквідацыі няпісьменнасьці ў Менску

Шмат якія прафэсыянальныя і партыйныя арганізацыі на прадпрыемствах Менску да гэтага часу ліквідацыю няпісьменнасьці лічаць лішнімі клопатамі.

Так, на заводзе «Дрэвапрацоўшчык» вельмі доўгі час нельга было распачаць заняткаў, бо... аўком не даваў памяшканьня і сьпісу няпісьменных і малапісьменных рабочых. Сакратар заводскай ячэйкі нават гаварыў: «э гэтага нічога ня будзе». Зараз заняткі праводзяцца, але вельмі дрэнна: далі прахадны пакой і праз увесь час заняткаў ня спыняецца хадзьба. Аўком дагэтуль ня мае вучоту колькі павінна займацца няпісьменных і малапісьменных.

На фабрыцы «Беларуска», фабрыцы імя «8-га Сакавіка» і на «Эльводзе» справа ліквідацыі няпісьменнасьці яшчэ торп. Старшыня фабкому каналізацыі т. Яшкевіч зусім шчэ справай займацца лічыць немэтазгодным. Ён прапанаваў рабочым школы не наведваць, а абяцаў даслаць кожнаму настаўніка на дом. Гэта зьяўляецца нічым іншым як сьвядомым зрывам ліквідацыі няпісьменнасьці.

Заўком «Эльводу» даў сьпіс на 12 няпісьменных і 20 малапісьменных, але заняткі наведвае толькі 1-2 чал.

Неабходна моцна ўдарыць па тых, хто ня прымае нізкіх захадаў да ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі ў галіне культурнай рэвалюцыі. Трэба па ўдарнаму ўзяцца за зьнішчэньне прарываў на фронце ліквідацыі няпісьменнасьці ў Менску.

Загароўскі.

Узяць на грамадзкі буксір Жлобінскі раён

За мінулы навучальны год на Жлобінскім раёне ліквідавала сваю няпісьменнасьць больш 3.000 чалавек. Сёлета - ж ліквідацыя няпісьменнасьці пасоўваецца наперад ужо чарапашымі тэмпамі. Плян па ахопе лікпунктамі няпісьменных выкананы ня больш як на 50 проц. і апрача таго маецца значны адсеў. Дэкада штурму ў раёне была правалена, вынікі яе да гэтага часу не падведзены.

Адказныя працаўнікі ў Райкоме кажуць самому ня ведаюць які ўдзел прымаюць камсамольцы ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці і колькі вылучана культармейцаў. Райпрафбюро адстала яшчэ больш. Тут ухітрыліся нават адасланць усе сьпісы вучоту няпісьменных у ЦСПСБ, а для сябе нічога не пакінулі. Вучоту няпісьменных членаў прафсаюзаў, якія ліквідуюць сваю няпісьменнасьць, няма.

Ёсьць апартуністычныя спробы зьнізіць тэмпы працы. Тав. Старавойтаў на прэзыдыуме райпрафбюро заявіў: «Конкурсу Жлобінскі раён ня возьме», а другі ўсьлед за ім прапанаваў узяць тэмпы не на 100-процантную ліквідацыю няпісьменнасьці сярод рабочых, а толькі на 80 проц. да 1 мая 1931 г.

Кіруючыя арганізацыі раёну да гэтага часу не зьвярнулі належнай увагі на справу культурнай рэвалюцыі, а ўся работа праходзіць самацёкам. Ды рэктывы партыі і ўраду па пытаньні ліквідацыі няпісьменнасьці пры існуючых у раёне тэмпах цяжка будзе выканаць.

Трэба Жлобінішчыну ўзяць на грамадзкі буксір і даць рашучы адпор усім тым, хто сваёй апартуністычнай недаацэнкай зрывае ліквідацыю няпісьменнасьці.

І—а.

ІХ МУЗЫКА

Вялікоднае

Грымяць музыка ў цэрквах і касьцёлах. Сьпяваюць хоры, бляюць «соло» кустары-псалмапеўцы... Гудуць арганы...

Арган—магутны музычны струмант. І недарма ён абраны на служэньне богу. Хоць божаньку цяжка даняць нават у спрунах і арганах.

Пра некаторыя арганы існуюць нават лягенды. Так, пра віленскі арган бяюць:

— Басы ў віленскім аргане, што трубы ерыхонскія... Калі першы раз гэтыя басы далі голас, дык шыбы касьцёльных вокан выляталі... Вось чаму арганіст віленскага касьцёлу не чапае вяжэйшых рэгістраў аргану, а вокны ў касьцёле і да гэтае пары не далічваюць шыбаў...

Ці так гэта? Цяжка праверыць... На «шклянку чорнай кавы» мы не паедзем да генэрала Жэлігоўскага...

У менскім касьцёле, што на плошчы Волі, арган больш пакойны. Ён ня б'е шыбаў у вокнах і наогул бярэ ўстаноўку больш на вябёсную ўрачыстасьць і мэлёдычнасьць, чымся на сілу гукаў.

Невядома, што рабіў-бы менскі касьцёл, калі-б яго аргану ды віленскія басы, а пакуль-што... у вокнах яго цэлыя шыбы.

І прыходзіцца дапаўняць арганную музыку галасамі веруючых. Вось ад таго, што ва ўнісон з арганам гучаць людзкія галасы, напаўна, і грымяць сьцены касьцёлу, а разам з імі і сьцены суседняй савецкай установы.

Ці хочаш, ці ня хочаш, а слухай як за сьцяною «хваляць бога» на аргане ды на струнах глотак.

Але «нябесная музыка» ня доймеш зямную савецкую ўстанову...

... Вялікодзень у цэрквах. Праводная нядзеля ў касьцёлах.

Ды ці толькі ў цэрквах і касьцёлах?!

У гэтыя дні лапы ўсіх краёў «сьпяваюць» ня толькі пра нябесны, але і пра зямны рай.

З парляманцкіх трыбун, у прыходжых высокапастаўленых асоб, у дамох і на вуліцах шыпяць і пенцяць гутаркі служак боскіх.

Галоўны аб'ект для палоў усіх мась

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ УРАДУ БССР

Пастанова
Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб перадачы вёскі Юркаўкі, Халмянскага сельсавету, Чэрыкаўскага раёну, у Студзянецкі сельскі савет, Клімавіцкага раёну.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **пастанаўляе:**

Перадаць вёску Юркаўкі, Халмянскага сельскага савету, Чэрыкаўскага раёну, у Студзянецкі сельскі савет, Клімавіцкага раёну.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**

1 красавіка 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова
Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб перадачы вёскі «Панізаўкі» Дубровенскага сельскага савету, Клімавіцкага раёну, у Сакольніцкі сельскі савет, Крычаўскага раёну.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **пастанаўляе:**

Перадаць вёску «Панізаўку», Дубровенскага сельскага савету, Клімавіцкага раёну, у Сакольніцкі савет, Крычаўскага раёну.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**

1 красавіка 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

пра парадак аплаты студэнтаў, якія камандыруюцца на гаспадарча-палітычныя кампаніі.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе пашырыць пастанову СНК БССР «Пра парадак аплаты рабочых і студэнтаў, якія камандыруюцца для правядзеньня вясновай пасеўнай кампаніі» (Газ. «Савецкая Беларусь» 1931 г. № 55) і на студэнтаў, якія камандыруюцца на іншыя гаспадарча-палітычныя кампаніі (лесазагатоўкі, сплаў і інш.).

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэк.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **С. Кандыбовіч.**

10 красавіка 1931 г.
гор. Менск.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

ПРА НАЗНАЧЭНЬНЕ т. КРАСОЎСКАГА, А. М., ЧЛЕНАМ КАЛЕГІІ ПРЫ НАРОДНЫМ КАМІСАРЫ СНАБЖЭНЬНЯ БССР.

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

Назначыць т. Красоўскага, Аляксандра Міхайлавіча, Членам Калегіі пры Народным Камісары Снабжэньня БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **С. Кандыбовіч.**

8 красавіка 1931 г.
г. Менск.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БСР

ПРА МЕРАПРЫЕМСТВЫ ДЛЯ БОЛЬШ ХУТКАГА АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЯ КРЭДЫТНАЙ РЭФОРМЫ.

СНК БССР адзначае, што гаспадарчыя і каапэрацыйныя органы ня ўжылі патрэбных захадаў для ажыцьцяўленьня пастановы СНК Саюзу ССР за 20 сакавіка 1931 г. «Пра зьмены ў сыстэме крэдытаваньня, узмацненьні крэдытнай работы і забясьпечаньні гаспадарчага разьліку ва ўсіх гаспадарчых органах» (Газ. «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» 1931 г. № 79) і пастановы СНК БССР за 13 лютага 1931 г. «Пра мерапрыемствы для палепшаньня практыкі крэдытнай рэформы» (З. З. БССР 1931 г., аддзел II, № 4, паст. 52) і не разгарнулі яшчэ дагаворнай кампаніі, не забясьпечылі своячасовага складаньня справаздачных матар'ялаў і наогул не пачалі перабудаваньне ўсяе сыстэмы для работы для забясьпечаньня нармальнага пераходу з 1 мая 1931 г. на новыя формы крэдытаваньня.

Савет Народных Камісараў падкрэсьлівае, што пытаньні выкананьня колькасных і якасных паказчыкаў прамфінпляну, накапленьняў, максымальнай эканоміі і мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў ня могуць быць правільна вырашаны без сапраўднага і ўсебаковага ўкараненьня гаспадарчага разьліку, як асноўнага мэтаду кіраваньня гаспадаркаю на даным этапе, ва ўсе зьвяньні дзяржаўных і гаспадарчых арганізацый.

Бяручы паказанае пад увагу, СНК БССР **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць ВСНГ, Народнаму Камісарыяту Снабжэньня, гаспадарчым аб'яднаньням, Белкаапсаюзу і ўсім цэнтрам сельскагаспадарчай каапэрацыі:

а) неадкладна вылучыць працаўнікоў, якія асабіста адказвалі за заключэньне дагавораў па снабжэньні і збыту сыравіны, матар'ялаў, апалу, аказаньні паслуг і інш. з іншымі гаспадарчымі і каапэрацыйнымі органамі;

б) забясьпечыць жывы інструктаж прадпрыемстваў і низавых арганізацый па ўсіх пытаньнях, зьвязаных з правядзеньнем дагаворнай кампаніі і ажыцьцяўленьнем новых форм крэдытаваньня.

2. Абавязаць гаспадарчыя аб'яднаньні на працягу двох дзён даць канкрэтныя паказаньні прадпрыемствам аб парадку заключэньня імі дагавораў і ў пасобку з якой арганізацыяй альбо прадпрыемствам, канкрэтна, яны павінны тэтыя дагаворы заключыць, аднасчасова забясьпечыўшы ўсе прадпрыемствы тыповымі формамі дагавораў.

3. Даручыць гаспадарчым аб'яднаньням тэрмінова:

а) распрацаваць пытаньні аб уласных зваротных сродках прадпрыемстваў і зараз-жа разьмеркаваць капіталы гаспадарчых аб'яднаньняў паміж прадпрыемствамі;

б) пераглядзець правы і абавязкі прадпрыемстваў і арганізацый у пасобку іх кіраўнікоў пад пунктам погляду стварэньня максымальна спрыяючых умоў для ўкараненьня гаспадарчага разьліку;

в) ужыць рашучыя захады для ліквідацыі запускаў у бухгальтэрыі, паскорыць выпіскі рахункаў і скончыць разьлікі з падпарадкаванымі ім прадпрыемствамі.

4. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам ужыць неадкладна захады да забясьпечаньня своячасовага правядзеньня дагаворнай кампаніі па арганізацыі і прадпрыемствах мясцовай прамысловасьці.

5. Даручыць НК РСІ на працягу 5 дзён праверыць як выканан гаспадарчымі і каапэрацыйнымі арганізацыямі арт. 7 памянёнай вышэй пастановы СНК Саюзу ССР за 20 сакавіка 1931 г. і не пазьней 18 красавіка 1931 г. паведаміць СНК аб выніках праверкі.

6. Прапанаваць усім гаспадарчым і каапэрацыйным арганізацыям—дастаўшчыкам у выпадку, калі ў дагаворах прадугледжана акцэптная форма разьліку, а арганізацыям-пакупнікам у выпадку, калі ў дагаворах прадугледжаны разьлікі ў форме акрэдытыву альбо асобнага рахунку, паладзь Дзяржпляну не пазьней 18 красавіка 1931 г. заяўкі на дадатковы крэдыт: дастаўшчыкамі—«па разьліковых дакумантах у дарозе», пакупнікамі—«па аплачаных таварах у дарозе».

7. Абавязаць гаспадарчыя арганізацыі не пазьней 18 красавіка 1931 г. аформіць свае ўзаемаадносіны з Дзяржбанкам у частцы крэдытаваньня сэзонных патрэб у зваротных сродках (арт. 4, пастановы СНК СССР за 20 сакавіка 1931 г.) праз выдачу абавязанасьцяй з устанаўленьнем тэрміну выплаты гэтага крэдыту.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **С. Кандыбовіч.**

11 красавіка 1931 г.
гор. Менск.

Сплаў патрабуе

хуткіх тэмпаў па вярбоўцы рабочай сілы, забясьпечаньня матар'яламі, чоткага кіраўніцтва з боку сплаўных кантор

У Глуску не хапае 300 сплаўшчыкаў.—Прафсаюзы яшчэ не павярнуліся тварам да сплаву

За своячасовую справаздачнасьць і дасылку зьвестак па сплаве

За подпісам упаўнаважанага СНК БССР па сплаве тав. **Амбражунаса** па трэсту Лесбел і сплаўных канторах дасланы загад, у якім ён піша:

— Улічваючы недахопы мінулых год у справе статыстычнай справаздачнасьці па сплаве, у мэтах зьнішчэньня меўшыхся недахопаў і правільнай пастаноўкі справаздачнасьці, пад асабістую адказнасьць загадчыкаў сплаўных кантор арганізаваць статыстычную справаздачнасьць, каб яна адпавядала і адказвала па ўсіх запатрабаваньнях сплаўнага аддзелу Лесбелаб'яднаньня, каб усе зьвесткі, своячасова і ў тэрміны прадстаўляліся сплаўнаму аддзелу бяз усялякіх спазьненьняў.

Спазьненае прадстаўленьне зьвестак у тэрміны, зрывае складаньне зводных па Лесааб'яднаньні зьвестак для прадстаўленьня Саюзлеспрому.

Для своячасовага прадстаўленьня сплаўнаму аддзелу зьвестак, сплаўным канторам неабходна атрымаць ад Леспрамгасаў і лесазаводаў зьвесткі для чаго:

Усе Леспрамгасы адначасова з прадстаўленьнем Лесааб'яднаньню дэкадных тэлеграфных зьвестак, таксама кожную дэкаду тэлеграфна паведамляць адпаведную сплаўкантору аб колькасьці падвезенай драўніны.

Тыя Леспрамгасы і склады, у якіх будуць выгружаць драўніну, прыбыўшую сплавам, пазіны кожную дэкаду не пазьней 15 гадз. апошняга дню дэкады, тэлеграфна паведамляць аб колькасьці выгружанай драўніны за кожную дэкаду.

Лесазаводам: кожную дэкаду не пазьней 15 гадз. апошняга дню дэкады тэлеграфна паведамляць сплаўную кантору аб колькасьці выгружанай драўніны.

У Глуску яшчэ няма рабочых для сплаву

На старонках «Савецкай Беларусі» мы пісалі ўжо аб тым, што Глускі леспрамгас знаходзіцца пад пагрозай зрыву сплаву. Да гэтага часу мапонаж амаль не зьмяніўся, як і раней не атрыманы для сплаву прадукты, прамтавары і боты.

Глускі леспрамгас прымацаваны да Мазырскай сплаўнай канторы, якая толькі і займаецца тым, што вымагае вестак. Да гэтага часу Мазырская сплаўная кантора ня выслала нават свайго прадстаўніка для ўдзелу ў падрыхтоўцы да сплаву.

Мазырская сплаўная кантора, праўда, паведаміла, каб з Глуску выслалі прадстаўніка для вярбоўкі рабочых (у Глуску не хапае 300 сплаўшчыкаў). Сплаўная кантора паведаміла, што ў іх маецца нарад на сплаўшчыкаў у Гомельскім раёне на 500 чалавек. Калі-ж прадстаўнікі Глускага леспрамгасу паехалі туды, дык аказалася, што нараду на рабсілу няма, а з боку трэсту Лесбелу тэлеграфуюць, каб Глуск адкінаў сваіх вярбоўшчыкаў з Гомлю і зьвярнуўся-б за сплаўшчыкамі ў Мазырскую сплаўную кантору. У выніку такой цягаціны было патрачана бескарысна шмат грошай, а рабсілы як ня было, так і няма.

Мазырская сплаўная кантора маўчыць як і раней.

Да пачатку сплаву ў Глуску засталіся лічаныя дні, а становішча падрыхтоўкі пагражаючае. Сплаў Глускага леспрамгасу зьяўляецца цяжэйшым сплавам у нас на Беларусі, бо трэба траляваць амаль-што ўсю драўніну на каналах і рачуках, дзе вада трымаецца толькі 15-18 дзён.

Трэба сапраўды па-бальшавіцку ўзяцца за падрыхтоўку да сплаву. Трэба памятаць работнікам сплаўканторы, Белкаапсаюзу, Лесбелу, што сплаў гэтага году мае выключна важнае значэньне.

Буткевіч, Курылаў.

„А можа крыху пацяплее"...

Лесавывазка па Пярэжарскім сельсавеце Сьмілавіцкага раёну праходзіць дрэнна. Сельсавет бязьдзейнічае, узяўшы стаўку на самацёк. Працаўнікі сельсавету разважаюць так: «А можа крыху пацяплее... навысьць плату за вывазку, тады сілянае ахвотней паедуць!».

Кулацка-заможныя гаспадаркі нават і ня думалі яшчэ брацца за вывазку лесу. Некаторыя кулакі распрадалі свае коні з мэтай, каб не вазіць лес.

А таму ня дзіва, што плян па вывазцы лесаматар'ялаў па сельсавеце выкананы на 5-10 проц.

З вёскі Зазер'я, якая налічвае 100 двароў, яшчэ ніводная падвода ня выяжджала ў лес. Гэта ўсё адбываецца тады, як тут маецца партыйная і камсамольская ячэйкі.

Трэба адзначыць, што асобныя партыйцы замест рашучага наступленьня на кулацка-заможную частку вёскі, каб апошнія выконвалі заданьні па лесазагатоўках, наадварот, зьяўляліся іхнымі абаронцамі.

Так, партыец, член прэзыдыуму сельсавету тав. **Вайтовіч** на бюро партыйнай ячэйкі, калі абгаворвалася пытаньне аб лесавывазцы, выступіў з прамовою:

— Траба пачакаць яшчэ некаторы час з гэтай кампаніяй, бо ў нас яшчэ сялянства, як кулакі, так і беднякі і сераднякі не абясьпечаны абуткам.

Гэтай кулацкай праваапартуністычнай вылазцы ня быў даны рашучы адпор. Сьмілавіцкаму РК КП(б)Б і РВК трэба зараз-жа прыняць самыя суровыя меры да зрыўшчыкаў лесавывазкі па Пярэжарскім сельсавеце.

Брыгадзір «Сав. Беларусі»
Цімох Лявіцкі.

Прафсаюзы павінны павярнуцца тварам да сплаву

У пачатку красавіка адбылася нарада старшынь раённых камітэтаў лесдрэўрабочых пры сплаўных канторах БССР

Нарада заслухала даклад прадстаўніка саюзу лесдрэўрабочых тав. **Эльпмера,** аб задачах прафарганізацыі на лесасплаве.

Дакладчык адзначыў, што выкананьне лесасплаву гэтага году мае важнейшае гаспадарча-палітычнае значэньне. На выкананьне гэтай праграмы патрабуецца напружаная работа гаспадарчых, партыйных і прафесыянальных арганізацый. Ад выкананьня пляну сплаву залежыць забясьпечэньне будаўнічымі матар'яламі напала сацыялістычнага будаўніцтва ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Трэба ўлічыць памылкі мінулага году з тым, каб не паўтараць іх у гэтым годзе. У параўнаньні з мінулым годам сёлета лесасплаў павялічваецца на 75 проц.

Адзэй з галоўных задач на сплаўным фронце зьяўляецца палепшаньне масавай работы прафарганізацый. На гэтым вучастку мы ў мінулым годзе мелі вялікі прарыў. Прафарганізацыі механічна пераключыліся з лесазагатовак на сплаў, не перабудаваўшы свайго апарату ў адпаведнасьці з задачамі сплаву. Рабачкомаў пры сплаўных пунктах у радзе месц ня было створана, а таму кіраўніцтва прафработай па сплаве і абслугоўваньні сплаўшчыкаў амаль адсутнічала.

У гэтым годзе нам патрэбна хутчэй узяцца за арганізацыю рабачкомаў пры сплаўных пунктах.

У мінулым годзе сярод рабочых сплаўшчыкаў амаль адсутнічала культ масавая і палітычна-выхаваўчая работа. У гэтым годзе, трэба гэты вучастак работы перабудаваць. Трэба заражэ пачаць арганізацыю чырвоных куткоў, набыць радыё, кіно для чырвоных лодак і г. д.

Прафарганізацыі на месцы павінны зараз-жа разгарнуць работу па разьвіцьці сацпаборніцтва ў ўдарніцтва сярод рабочых сплаву і тым самым паднясьці тэмпы выкананьня пляну сплаву.

Рабочае забясьпечаньне таксама адыгрывае выключную важнасьць. Ужо на гэтым пытаньні ёсьць ня мала пастаноў і дырэктыў вышэйшых органаў, але нажаль яны слаба ажыцьцяўляюцца. У гэтым пытаньні зацятае Белкаапсаюз. Да гэтага часу яшчэ ні ў адным раёне няма фонду для сплаўшчыкаў. Тут прафарганізацыі павінны зьвяцца кантролем як забясьпечваюцца рабочых харчамі, прамтаварамі і г. д.

Трэба прагледзець, ці ўсе сродкі, адпушчаныя ўрадам на жыльлёвае будаўніцтва скарыстаны. Жыльлёвымі будынкамі мы павінны забясьпечыць рабочых поўнасьцю.

Задачы, якія стаяць перад прафарганізацыямі павінны быць выкананы поўнасьцю і ў тэрмін. Кожная нізавая прафарганізацыя, кожны член саюзу, павінны цьвёрда ведаць, што сплаў—адзін з вучасткаў баявой работы трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

А. Вясёлы.

У Прэзыдыуме ЦВК БССР

На апошнім пасяджэньні Прэзыдыуму ЦВК БССР, якое адбылося пад старшынствам т. **М. П. Гнілякевіча,** былі разам з іншымі разгледжаны наступныя пытаньні:

ПРА ВЫНІКІ ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ ЛЫЖНАЙ ЭСТАФЭТЫ

Заслухан даклад Вышэйшага савету фізычнай культуры пра вынікі Ўсебеларускай лыжнай эстафэты. Усебеларуская лыжная эстафэта была праведзена ў гонар Х-та Ўсебеларускага Зьезду саветаў. У эстафэце прымаў удзел 51 раён з агульнай колькасьцю ў 2.994 чалавек, з гэтай колькасьці 124 чал. прымалі ўдзел ва Ўсесаюзнай эстафэце «Готов к труду и обороне». Лыжная эстафэта зьявілася масавым грамадзка-палітычным мерапрыемствам, якая прайшла ў асноўным пад лёзунгамі: мабілізацыя працоўных мас навакол выкананьня задач 3-га рашаючага году пяцігодкі, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і абароны краіны; збор і дастаўка Х-му Ўсебеларускаму і VI-му Ўсесаюзнаму зьездам саветаў рапартаў фабрык, заводаў, калгасаў, саўгасаў і інш. аб іх дасягненьнях у галіне сацыялістычнага будаўніцтва і гатоўнасьці да абароны краны саветаў. Такіх рапартаў эстафэта сабрала і даставіла Ўсебеларускаму зьезду саветаў 346 і Ўсесаюзнаму 77. Эстафэта аказала значную дапамогу мясцовым органам у правядзеньні розных палітычна-гаспадарчых кампаній.

Прэзыдыум ЦВК прызнаў, што лыжная эстафэта, тыя задачы, пад лёзунгамі якіх яна праходзіла, у асноўным выканала. Побач з гэтым адзначан шэраг недахопаў у правядзеньні эстафэты. Прэзыдыум ЦВК даручыў ВСФК, ведамствам і грамадзкім арганізацыям шырока папулярызаваць вынікі эстафэты, скарыстоўваючы каштоўны вопыт апошняй з мэтай узмацненьня тэмпаў разьвіцьця фізкультурнага руху ў БССР.

АБ БЫТАВЫМ АБСЛУГОЎВАНЬНІ КАЛГАСЬНІЦ І САЎГАСЬНІЦ

Заслухан даклад намесьніка Старшыні Бытавога Камітэту пры Прэзыдыуму ЦВК БССР тав. **Майзіт** аб бытавым абслугоўваньні калгасьніц і саўгасьніц. У адпаведнасьці з дырэктывай III-й сэсіі ЦВК БССР IX-га скліканьня, распрацаваны канкрэтны плян будаўніцтва бытавых устаноў у калгасах, саўгасах і аднаасобных сялянскіх гаспадарках на 1931 г. На арганізацыю бытавых устаноў па вясковай сетцы асыгнавана: 1.458.000 руб. На гэтыя сродкі будуць адчынены дзіцячыя ясьлі, пляцоўкі-прымітыўкі і іншыя дзіцячыя ўстановы. Вызначаныя плянам мерапрыемствы павінны значна палепшыць становішча працоўных жанчын. У зьвязку з разгортваньнем пялікай сеткі бытавых устаноў, адчуваецца недахоп кадраў. Бытавым Камітэтам, НК Асьветы і НК Аховы Здароўя вызначаны мерапрыемствы па падрыхтоўцы кадраў для ясельных і дашкольных работнікаў.

Для распрацоўкі праекту пастановы на заслуханым дакладзе Прэзыдыумам ЦВК утворана камісія ў складзе т.т. **Вансоўскага, Марусевіч і Майзіт.**

ПЛЯН РАБОТЫ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК

Зацьверджан плян работы Прэзыдыуму ЦВК БССР на паўгодзьдзе—красавік-верасень 1931 г. Гэтым пляном прадугледжана заслухоўваньне шэрагу дакладаў і вырашэньне розных пытаньняў у галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, а таксама і арганізацыйна-масавай дзейнасьці саветаў і выканкомаў. Значнае месца адведзена ў пляне пытаньням палепшаньня работы сярод жанчын, палепшаньня ўмоў працы і бытавых умоў работніц, батрачак, калгасьніц і сялянак-бяднячак і серднячак, далейшага ўцягненьня іх у савецкае будаўніцтва. На Прэзыдыуме ЦВК будуць заслуханы даклады: адпаведных наркаматаў і шэрагу РВК і гарсаветаў аб арганізацыйна-масавай рабоце сярод рабочых мэталёвай, фасфарытнай, шкляной і тэкстыльнай прамысловасьці і аб абслугоўваньні іх сацыяльна-культурнымі і бытавымі ўстановамі; аб рабоце дамоў сялянна; арабачэньне савецкага апарату; эканамічна-гаспадарчае раёнаваньне БССР; пытаньні вясновай сяўбы і калектывізацыі, шэраг тэматычных дакладаў РВК і Гарсаветаў па паасобных галінах сацыялістычнага будаўніцтва і інш.

АБ САВЕТАХ КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА ПРЫ НАРКАМАСЬВЕТЫ, САВЕТАХ І ВЫКАНКОМАХ

Прэзыдум ЦВК зацьвердзіў праект пастановы ЦВК і СНК БССР пра ўтварэньне саветаў культурнага будаўніцтва пры Наркамасьвеце, саветах і раёвыканкомах. У абавязкі саветаў уваходзяць: прапрацоўка адзіных пляноў культурнага будаўніцтва, садзейнічаньне і кантроль за выкананьнем усімі ўстановамі і арганізацыямі адзінага пляну культурнага будаўніцтва, мабілізацыя пралетарскай грамадзкасьці і шырокіх колаў працоўных мас для актыўнага ўдзелу на ўсіх вучастках культурнага будаўніцтва.

Наркамасьветы даручана ў дэкадны тэрмін скласьці праект палажэньня аб саветах культурнага будаўніцтва.

ПРА ЗЬМЕНЫ Ў КОДЭКСЕ АБ ПРАЦЫ

Зацьверджана пастанова пра зьмену арт. арт. 5-9, 29 і 115 Кодэксу аб працы БССР.

Згодна гэтай пастановы, усе прадпрыемствы, установы, гаспадаркі і асобы павінны наймаць рабочых і служачых толькі праз органы працы, не праз органы працы дазваляецца наймаць: адказных адміністрацыйна-тэхнічных працаўнікоў, у параўнаньні з пераводу з аднае ўстановы ў другую, хатніх работніц, батракоў аднаасобным сялянкам гаспадаркам і іншых на падставе спэцыяльных згод з органамі працы.

Рабочым беспасрэдна занятым на вытворчасьці ў горнай, мэталёвай, хімічнай і тэкстыльнай галінах прамысловасьці, у прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў, на чыгуначным, водным і аўтадорным транспарце і на буйных будаўніцтвах, калі яны працавалі там ня менш 2-х год даецца дадатковы водпуск на 3 дні.

НАЗНАЧЭНЬНІ

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў аслабаніць т. **Ледніка І. Т.** ад абавязкаў Намесьніка Ўпаўнаважанага Наркамшляхаў СССР пры СНК БССР.

Намесьнікам Упаўнаважанага Наркамшляхаў СССР пры СНК БССР назначан тав. **Элге Р. Я.**

Рабселькоры пішуць

На 8-ым цагельным заводзе (Менск) у якасьці рахункавода працаваў **Пера возьнікаў,** які на работу заўсёды прыходзіў п'яным; адміністрацыя зьняла яго з работы і перавяла на вытворчасьць. Ён на завод таксама прыходзіць п'яным і перашкаджае выконваць прамфінплян.

Адміністрацыі заводу неабходна зусім зьняць з работы тав. Перавозьнікава.

А. Сьмелы.

Копыльскае Райпрафбюро да гэтага часу не перабудавала сваю работу на новыя рэйкі. Прафсаюзы Копыльшчыны адстаюць ад сучаснага жыцьця, ніякай работы па ажыцьцяўленьні задач партыі і ўраду не відуць.

Райпрафбюро зусім ня цікавіцца жыцьцём і работай членаў саюзу. Райпрафбюро і асобныя рабачкомы не праводзяць ніякай культмасавай і выхаваўчай работы сярод жанчын—членаў саюзу.

Вішня.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА (Савецкая, 68).

Сёньня 12-га красавіка а 7-й гадзіне ўвечары Сэкцыя Нарысу пры БелАПП'е наладжвае творчы разгляд нарысаў Цім. Зарэчнага—«Узбуджаная зямля» і «Сустрэчны».

Просьба да ўсіх пісьменьнікаў, членаў сэкцыі нарысу, літстудыйцаў, студэнтаў Камвузу, БДУ, Пэдтэхнікуму, рабфакаўцаў прыняць удзел у творчым разглядзе вышэйпаказаных нарысаў. Уваход вольны.

Праўленьне Дому Пісьменьніка.

ПЭДГАБІНЭТ

13-га красавіка а 7 гадзін ўвечары агульны сход настаўнікаў 1-х груп.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

З ПАНЯДЗЕЛКА 6-га КРАСАВІКА

Кіно-тэатр „Культура"	УГУБЗІАРА Хроніка Саюзкіно № 12. Пач.: 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса—з 5 гадз.
„Чырвоная Зорка"	Новы савецкі фільм ГОСЬЦЬ З МЭКІ Пачатак а 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса адч. з 5 г.
Кіно „Інтэрнацыянал"	Гістарычны фільм ЛЕДЗЯНЫ ДОМ Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 г.
Кіно „Пралетары"	У лепш. комэд. Монці Бэнкс ЛЁТАЮЧАЕ ШЧАСЬЦЕ Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 гадз.
Кіно „Юны Піянэр"	2-гі тыдзень АБРЭК ЗАУР Пачат. сэансу а 1 г. дню. Каса адч. з 11 г. 30 хв.

АД БЕЛКАНТОРЫ ДЗЯРЖБАНКУ

Пачынаючы з 11-га красавіка штодзённа ў памяшканьні Менскага гарадзкога аддзяленьня дзяржбанку ў пакоі крэдытна-плянавага аддзелу (1 паверх) ад 9 гадзін да 12 гадз. дня і ад 8 гадз. увечары

БУДЗЕ ДАВАЦЦА КАНСУЛЬТАЦЫЯ

ПА ПЫТАНЬНЯХ ЗЬВЯЗАНЫХ З ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ ЗАКОНАЎ АД 14-І і 20-III—31 г. АБ ЗЬМЕНАХ У СЫСТЭМЕ КРЭДЫТАВАНЬНЯ.

№ тэлефону дзяжурнага кансультанта—13-56.

Даводзіцца да ведама ўсіх устаноў і прадпрыемстваў гораду Менску,

ШТО

ПАТРАБАВАНЬНІ НА РАБСІЛУ

ПРАВОДЗЯЦЦА ВЫКЛЮЧНА ПА ЎСТАНОЎЛЕНАЙ ФОРМЕ.

Парадак патрабаваньня ёсьць у самых бляках.

Бляпкі патрабаваньня неабходна атрымаць у кіраўніцтве кадраў, г. Менску (рог Ленінскай і Універсытэцкай, № 26-31)

Усялякія патрабаваньні не па форме выконвацца ня будуць.

МЕНСКІ ГАРФІНАДДЗЕЛ

— АБВЯШЧАЕ, —

што згодна пастановы СНК СССР, усе дзяржаўныя ўстановы і прадпрыёмствы, а таксама і каапэрацыйныя арганізацыі павінны да 13-га красавіка г. г.

АБМЕНЯЦЬ У ДЗЯРЖБАНКУ НАЛЕЖАЧЫЯ ІМ АБЛІГАЦЫІ

—дзяржаўных выйгрышных пазык—

НА АБЛІГАЦЫІ 4-ай ДЗЯРЖАЎНАЙ УНУТРАНАЙ 8% ПАЗЫКІ 1928 г.

Паколькі некаторыя дзяржустановы такога абмену яшчэ ня вытварылі, Гарфа прапануе безадкладна вытварыць гэты абмен.

ГАРФА

Да ведама менскіх рабочых калектываў, маючых гароды!

ЗЯМЕЛЬНЫ АДДЗЕЛ ГАРСАВЕТУ

даводзіць да ведама ўсіх гарадзкіх калектываў, фабрык, заводаў і арганізацый,

маючых гародныя плошчы

АБ ТЫМ, ШТО

для атрыманьня гароднага насеньня неабходна зараз-жа падаць у РАЙКААПСАЮЗ (Комсамольская, 11) ЗАЯЎКУ.

У ЗАЯВЕ ПАКАЗАЦЬ: 1) агульную плошчу гароду; 2) памячаемую плошчу пад асобныя гародныя культуры; 3) патрэбную колькасьць насеньня па культурах.

Земаддзел Гарсавету.

МЕНСКІ Дзяржаўны Архітэктурна-Будаўнічы Тэхнікум АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА 1-шы КУРС ТЭХНІКУМУ.

— Прынята будзе 40 асоб. —

Прыём заяў з 15 па 25 красавіка г.г. штодзённа ў канцэлярыі тэхнікуму (Менск, вул. Карла Марса, д. № 37) з 9 да 4-х гадзін.

Пачатак заняткаў 5-га мая г. г.

Правілы прыёму ў даведніку НКА, выдадзеным у мінулым годзе.

ДА ГЭТАГА ЧАСУ

надта марудна паступаюць у Наркампрацы БССР веды аб СПЭЦЫЯЛІСТАХ СПЛАВУ.

Наркампрацы БССР папярэджвае і ПРАПАНУЕ прадставіць іх **ДА 13 КРАСАВІКА,**

у супраціўным выпадку справа будзе перададзена ў судовыя органы.

Старшы Інспэктар НКПБ САКОЛЬЧЫК.

ЗГУБЛЕНЫ:

Паявая кніжка Кімава М. Ф., выд. Праўл. Асінбуд. ЦРК № 9443. Квіт. 1505-п.

Наборны ліст Сіліванава Івана, выд. асабов. стал. Асінбуду. Квіт. 1505-п.

Хлебная картка Крывенка Я. Т., выд. асабовым сталом Асінбуду. Квіт. 1505-п.

Хлебная картка Ланцэдава С. Д., выд. асабовым сталом Асінбуду. Квіт. 1505-п.

Хлебная картка Федосенка М. І., выд. асабовым сталом Асінбуду. Квіт. 1505-п.

Наборны ліст Гаўрыленка Ф. А., выд. асабовым сталом Асінбуду. Квіт. 1505-п.

Разьлікавая кніжка Давідзенка Н. Ф., выд. кіраўн. Асінбуду. Квіт. 1505-п.

Пасьведчаньне Сінельнікавай Соні, выд. Мітаслаўскай РСІ. Квіт. 1505-п.

Паявая кніжка Цяцюшовай Я. Л., выд. Аршанскім ЦРК за № 7799. Квіт. 1505-п.

Паявая кніжка Бабіча Е. М. № 1822, выд. Асінбуд. ЦРК маг. № 16. Квіт. 1505-п.

Паявая кніжка Ерменка В. С. № 1514, выд. Асінстроеўск. ЦКР. Квіт. 1505-п.

Сэзонная паявая кніжка Якубенка В. В., выд. ЦРК пры Асінбудзе. Квіт. 1505-п.

Тутунёвая картка № 5479 Кагана З. І., выд. маг. № 16 пры Асінбудзе. Квіт. 1505-п.

Тутунёвая картка № 6973 Хамутоўскага І. А., выд. маг. № 16 ЦКР пры Асінбудзе. Квіт. 1505-п.

Паявая кніжка Пульянава Ермалая, выд. маг. № 18 Арах. ЦКР. Квіт. 1505-п.

Наборная кніжка Пульянава Е., выд. маг. № 18, выд. Аршанск. ЦРК. Квіт. 1505-п.

Праюсаюзны білет Назарава І. [illegible] выд. Шатурстроеўск. саюз. мэталіста Квіт. 1505-п.

Воінскі білет Назарава І. Г., выд. Шатурстроеўск. РСІ. Квіт. 1505-п.

Паляўнічы білет Назарава І. Г., выд. Арэхстроеўскім паляўнічым гуртком. Квіт. 1505-п.

Сэзонная паявая кніжка Шабалды С. за № 1715 на 5 р., выд. Аршанск. маг. № 18. Квіт. 1505-п.

Паявая сэзонная кніжка Сьвіціна Д. І., выд. ЦРК маг. № 18 пас. Арахі. Квіт. 1505-п.

Сэзонная паявая кніжка Сьвіціна І., выд. Аршан. ЦРК маг. № 18 пас. Арахі. Квіт. 1505-п.

Наборная хлебная картка Курачкіна Д. Квіт. 1505-п.

Пасьведчаньне Федарэнка С. і конскія карткі. Квіт. 1505-п.

Мэтрычная даведка Кашэля А., выд. Бярэзінскай Раймілцыяй. Квіт. 1506-п.

Паявая кніжка № 1351 Драпеза Я. В., выд. Азарыцкім спаж. т-вам. Квіт. 1509-п.

Вайсковая картка Малішэўскага А., выд. Азарыцкім РВК. Квіт. 1510-п.

Пячатка Скараднянскага К-ту Ўзаемадапамогі. Квіт. 1511-п.

Вайсковы білет Мішкова І. С., выд. Лельчыцкім Райваенкаматам. Квіт. 1512-п.

Патэнт за № 46 Плучыка М. Р., выд. Чэрвеньскай Фінчастканай. Квіт. 1513-п.

Каапэрацыйная кніжка № 648 Бабіцкага П. Я., выд. Раваніцкім спаж. т-вам. Квіт. 1514-п.

Членскі білет саюзу работн. зямлі і лесу за № 56806, камсамольскі білет і мэтрычная даведка Навіцкага Я. З. Квіт. 1515-п.

Членскі білет № 6-53819 Лісіцы Т. П., выд. Н.-Барысаўскім рабачкомам будаўнікоў. Квіт. 1516-п.

Паявая кніжка, выд. Азарыцкім спаж. т-ва за № 881 на імя Мальца М. А. Квіт. 1517-п.

Членскі білет Марозава П. Ц., выд. ЦП Саюзу Сувязі. Квіт. 1518-п.

Пашпарт Кіклевіча В. Н., выд. Чэрвенскай міліц. і даведка аб нараджэньні. Квіт. 1519-п.

Пасьведчаньне Качана Д. Р., выд. Нараўлянскім РВК. Квіт. 1522-п.

Вайсковы білет жых. с. Валаўска, Скараднянскага сельсавету, Каралінскага раёну Рамановіча Д. Квіт. 1523-п.

Пасьведчаньне аб нятоднасьці да вайсковай службы Яцко Н. М., выд. Мазырскім Аркваенкаматам. Квіт. 1524-п.

Пашпарт і даведка аб маёмасьці за № 1441 ад 30-XI-30 г., выд. Касьцюковіцкім м-саветам і мэтрычны выпіс на імя Ваўчкова М. А. Квіт. 1525-п.

Вайс